Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 30 (2880) Год LVI | Беласток, 24 ліпеня 2011 г. | Цана 2,50 зл. (у тым VAT 5%)

Пасля амаль двух гадоў 13 ліпеня перад беластоцкім Акруговым судом кочныўся працэс аб люстрацыйным падмане ў дэпутацкай заяве, у якім абвінавачвала Яўгена Чыквіна (СЛД) дэлегатура Інстытута нацыянальнай памяці (ІНП) у Беластоку. Прысуд адчытаны старшынёй суддзейскага складу Беатай Аліферук гучаў: „Яўген Чыкін падаў 20 верасня 2007 года люстрацыйную заяву згодную з праўдай". Дэпутат, чуючы гэтыя словы, пераражагнаўся і ўздыхнуў з палёгкай.

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

Дэпутат не маніў

Яўген Чыквін і яго абаронца Кшыштаф Чашэйка-Сахацкі

Дакументы, змешчаныя ў актах справы, мелі паказваць на тое, што Яўген Чыквін у 1982 г. меў быць зарэгістраваны як кандыдат на сакрэтнага супрацоўніка, а пасля на сакрэтнага супрацоўніка. Служба бяспекі дала яму спачатку псеўданім „Ізыдар", а пасля „Вільгельм". На працягу ўсяго працэсу дэпутат заяўляў, што не быў сакрэтным супрацоўнікам ПНРаўскай Службы бяспекі. У сваёй апошняй мове амаль тыдзень да аб'яўлення прысуду сказаў перад судом:

— Я ніколі не супрацоўнічаў з ніякімі органамі бяспекі ПНР, ані вольнай РП. Я адчуваю сябе ахвярай дзеянняў ПНРаўскай СБ, савецкага КДБ і нягодных паводзін ІНП.

Пракурор ІНП Агнешка Русіловіч патрабавала тады забароны на восем гадоў выконвання дэпутатам Чыквіным публічных функцый.

У час апошняга разбору старшыня судзейскага складу абгрунтоўвала прысуд:

— Паводле ацэнкі суда, зменьваныя паказанні функцыянераў СБ, некамплектныя дакументы, у якіх ёсць недагаворкі, рознага тыпу супярэчлівасці, недахоп пацвярджэння, што Яўген Чыквін забавязаўся да супрацоўніцтва, неістотны змест нататак робленых функцыянерамі ў справах вядомых і яўных або несапраўдны змест — агулам не выкананы прадпасылкі, аб якіх гаворка ў адпаведным законе рашэння Канстытуцыйнага трыбунала паказваюць на тое, што гэтыя крышынкі дакументаў і марнай доказнай каштоўнасці паказанні былых функцыянераў СБ наводзяць шмат сумненняў. Іх так многа, што суд не можа палічыць, што Яўген Чыквін быў сакрэтным супрацоўнікам СБ. Дарэчы, на такой пазіцыі раней, апіраючыся на тыя самыя доказы, стаяў абаронца публічнага інтарэсу.

Дадала м.інш.:

— У службах бяспекі ПНР рознае тварылася і без ведама канкрэтных асоб можна было весці іх папкі персанальныя і працы, даваць ім псеўданімы, а, як вядома, фукцыянераў СБ разлічвалі з колькасці ведзеных імі сакрэтных супрацоўнікаў. І, мабыць, маючы службовыя кантакты з Яўгенам Чыквіным, зарэгістравалі яго як сакрэтнага супрацоўніка, ды да канца гэта сцвердзіць немагчыма. Абапіраючыся на прадстаўленыя доказы таксама нельга асудзіць Яўгена Чыквіна на цывільную смерць.

Раней звяртала ўвагу:

— Яўген Чыквін прызнаўся, што ўтрымліваў кантакты з СБ, ды гэта па прычыне выконваных функцый, асабліва старшыні беластоцкага аддзела Хрысціянскага грамадскага згуртавання (ХГЗ). (...) Сабраныя дакументы ў справе гэта парэшткі па СБ, сляды дакументаў. Гэта папка з надпісам „Eugeniusz Czykwin" , якая з'яўляецца зборам дакументаў (...). Дакументацыя ў выглядзе копій дакументаў, а таксама копій з копій дакументаў змешчаная ў актах справы, шмат у ёй таксама перакрэсленняў. Перш за ўсё ў ёй шмат разыходжанняў. Невядома, ці былі ведзены папкі персанальная і працы, ці былі знішчаны абедзве папкі, ці толькі адна. Ёсць разыходжанні пры датах. Можна сумнявацца, ці існаваў адпаведны мікрафільм, ці не. (...) Ні адзін з распытваных функцыянераў СБ не быў у змозе сказаць, чаму дайшло да змены псеўданіма. Гэтыя паказанні выклікаюць шмат сумненняў (...). Фунцыянераў службаў бяспекі абучалі і абучаюць у дэзінфармацыі. Іх паказанні гэта дасканалы прыклад на тое, як знакаміта абучыліся яны ў галіне дэзінфармацыі.

Суддзя прыгадала таксама, што ўжо некалькі гадоў таму з паказанняў функцыянераў СБ перад абаронцам публічнага інтарэсу вынікала, што Яўген Чыквін мог быць службовым кантактам:

— Такімі службовымі кантактамі ў той час былі ўсе, хто займаў відныя пасады. Старшыня ХГЗ таксама мусіў утрымліваць кантакты з СБ. Не мог ад гэтага выкрунуцца. Прыходзілі функцыянеры ў офіс ХГЗ і патрабавалі адпаведных інфармацый. Былі гэта, дарэчы, інфармацыі паўсюдна даступныя. Яўген Чыквін у час размоў з функцыянерамі нічога асаблівага не выяўляў. З паказанняў гэтых сведкаў (функцыянераў — М. Х.) вынікае, што Яўгену Чыквіну ніколі і нікім не ставіліся задачы, а такія атрымліваў кожны сакрэтны супрацоўнік.

І адзначыла:

— Гэтыя паказанні круцельскія і суд не можа палічыць іх верагоднымі і паўнапраўнымі доказамі (...). Папка з надпісам „Eugeniusz Czykwin", не з'яўляецца папкай сакрэтнага супрацоўніка. Гэтая папка, як тлумачылі працаўнікі ІНП, гэта збор дакументаў, якія прыйшлі ў кардонках з Установы аховы дзяржавы, пазнейшага Агенцтва ўнутранай бяспекі. Гэтыя дакументы былі перагледзены і счэплены ў адну папку. Гэта дакументы, якіх нельга верагодна пацвердзіць іншымі доказамі.

Дэпутат Чыквін пасля прысуду ў калідоры суда сказаў журналістам:

— Гэты разбор не застанецца без пазітыўнага выніку. Працэс абверг распаўсюджваны працаўнікамі ІНП міф, што СБ не фальшавала сваіх дакументаў. Падраблялі не толькі, як у выпадку Яраслава Качынскага, „лаялку", але і подпісы сваіх афіцэраў (дакумент з такім фальшывым подпісам ІНП далучыў да акт справы дэпутата Чыквіна — М. Х.). Пракурор ІНП увогуле не цікавіла пытанне фальшавання дакументаў, якое з'яўляецца правапарушэннем ПНР. Не цікавіла яе, што СБ па даручэнню КДБ, закладвала мне падслухоўванне. ПНР не была аж такой залежнай, каб слухаць загады чужых службаў. У гэтым люстрацыйным імкненні, маючы рашэнне аўтарытэта ІНП, абаронцы публічнага інтарэсу Багуслава Нізенскага, што няма падстаў для ўзбуджэння люстрацыйнага працэсу, такую заяву ўсё ж накіравала. Я гэта прымяркоўваю да маёй палітычнай ангажаванасці, да маіх дзеянняў дзеля кампенсацыі сем'ям закатаваных атрадам „Бурага". Да лістапада ў беластоцкім аддзеле ІНП вісеў яго агромны партрэт. Толькі на маю інтэрвенцыю яго адтуль знялі. Прыгадаю толькі, што той самы ІНП даказаў, што „Буры" віноўны ў генацыдзе праваслаўнага насельніцтва.

Прадставіў таксама абвінавачанне ІНП:

— У люстрацыйным імкненні ІНП двойчы парушыў закон. Парушыў закон аб ІНП, прызнаючыся, што знішчаў дакументы і ствараў на тое месца іншыя, з іншым зместам. Гэта проста скандал! Парушыў таксама закон аб ахове прыватных даных. Нельга рассакрэчваць тых асабістых даных, да якіх належаць веравызнанне і нацыянальнасць. ІНП не павінен гэтага рабіць не так у адносінах да мяне, люстраванага, але і маіх сяброў, з якімі мы будавалі Брацтва і працавалі ў ХГЗ.

І падвёў свой працэс:

— На пачатку гэтага разбору на інтэрнэтных форумах (пасля рэдакцыі сталі рэагаваць) пачаўся спектакль нянавісці. І нават не непасрэдна да мяне, але ў адносінах да вернікаў праваслаўя і прадстаўнікоў беларускай нацыі (...). Расцягванне гэтага разбору мела на мэце пазбаўленне мяне таго, што ў мяне найважнейшае — публічнага даверу.

Яшчэ да пачатку апошняга разбору прысутная ў судзе жонка дэпутата Чыквіна не хавала ў размове з „Нівай" жалю:

— Гэта Кафка! Мой муж шмат кім стаў успрымацца як крымінальнік, бо суды асацыююцца са злачынцамі. Гэта было прыніжальным. Займаўся два гады эсбэцкімі дакументамі, замест засяродзіцца выключна на дэпутацкай працы.

Прысуд яшчэ неправамоцны. Пракурор Русіловіч у размове з „Нівай" не выключала, што пасля азнаямлення з пісьмовым абгрунтаваннем прысуду падасць апеляцыю (мае на гэта 14 дзён пасля атрымання абгрунтавання). Калі так адбудзецца, Апеляцыйны суд пачне гэтую справу на працягу некалькіх найбліжэйшых месяцаў, праўдападобна пасля асенніх парламенцкіх выбараў, у якіх мае намер стартаваць Яўген Чыквін. Пасля яшчэ бакі могуць падаць касацыю ў Найвышэйшы суд.

9 770546 196000

Трагедыі і прэміі

Напісана на гэтую тэму ўжо нямала. Але няма мяжы чалавечай сквапнасці і абыякавасці да іншых. Кожны раз, слухаючы пра чарговую катастрофу на бяскрайніх расійскіх прасторах, спачуваеш няшчасным ахвярам чарговай расійскай неверагоднай нядбайнасці і разам з тым не перастаеш дзівіцца ментальнасці гэтай „супердзяржавы". І ў космас яна лятае, і нейкія вышэйшыя тэхналогіі ўкараняе і многія стагоддзі прэтэндуе на гегемонію ў свеце амаль ва ўсіх сферах чалавечай дзейнасці. А вось паклапаціцца пра чалавека, забяспечыць самае простае, парупіцца пра элементарную тэхніку бяспекі і не думае. Прырода такога анамальнага мыслення вынікае з аднаго — з таго, што ў Расіі дзяржава — гэта ўсё, асобны чалавек — гэта нішто. Так было яшчэ пры Іване Жахлівым, так застаецца і пры Уладзіміру Пуціне. І нічога не мяняецца стагоддзямі ў гэтай імперыі, якая скрозь збудаваная на касцях безлічы ахвяр, прынесеных на алтар шавіністычнай „вялікай ідэі". „Гібель мільёнаў — гэта статыстыка", — такой формулай крывавы генералісімус Сталін сфармуляваў асноўную дактрыну расійскай дзяржавы. Характэрна, што найбольш крывавая постаць у гісторыі чалавецтва — а ў гэтай намінацыі Сталіну не складуць канкурэнцыі нават Гітлер з Пол Потам — па-ранейшаму папулярны на расійскай і суседняй прасторы. Страшна яшчэ, што найбольшы яго культ якраз у Беларусі, анахранізме-філіяле савецкай мадэлі.

Іншы нацыянальны герой Расіі — Пётр І быў па вызначэнні сённяшняга дня серыйным забойцам, уласнаручна адсякаў галовы дзесяткам людзей (тут яму можна прыгадаць публічнае масавае пакаранне смерцю стральцоў у іхным Крамлі ці забойства манахаў у нашым Полацку) і нават роднага сына свайго загадаў задушыць, што і было выканана. Словам, крывавы страшны маньяк, але на цэнтральных пляцах расійскіх гарадоў стаяць помнікі менавіта яму — Пятру Першаму, „рэфарматару", які нібыта прасек для сваёй краіны „акно ў Еўропу".

У сувязі з катастрофай цеплахода „Булгарыя" на Волзе падумалася яшчэ раз пра будаўніцтва атамнай станцыі на Астравеччыне. Як дзяржава, якая не можа забяспечыць правілы прасцейшай бяспекі на караблі, зможа забяспечыць і гарантаваць адпаведныя тэхналогіі пры стварэнні такога складанага ў тэхнічным плане аб'екта як атамная электрастанцыя!? Усе ведаюць, што Расія так і не навучылася належна рабіць нічога з тэхнікі: ні тэлевізараў, ні аўтамашын, ні-чо-га ўвогуле. Чаму ж грамадзяне Беларусі павінны даць веры, што яна пабудуе нам бяспечную атамную станцыю? Нават надзвычай адказныя і звышакуратныя японцы не здолелі застрахавацца ад прыроднай стыхіі і яшчэ доўга будуць перажываць наступствы аварыі. Нават педантычныя немцы, у якіх усё вылічана да міліметра і еўрацэнта, адмаўляюцца ад эксплуатацыі старых і пабудовы новых атамных станцый. А беларуская дзяржава запрашае да гэтага мегапраекта расійскіх будаўнікоў. А ў гэтых расійскіх гора-будаўнікоў нават дамы валяцца без усялякіх землятрусаў. Адзінае, што ў іх стаіць — гэта Крэмль — і той узвялі некалі гомельскія будаўнікі!

Расійскае кіраўніцтва, аднак, пераканана, што яно за свае рэсурсы і грошы можа купіць усё ў свеце. Так, як купіла яно правы на сочынскую зімовую алімпіяду і на правядзенне чэмпіянату свету па футболе. Прычым, усе ведаюць, што Расія не мела на гэта ніякіх арганізацыйных і „ідэалагічных" падстаў, што гэтыя правы сапраўды не заслужаныя, а купленыя, што карупцыя ўшчэнт раз'ела адпаведныя міжнародныя структуры. Дзіўна яшчэ, што днямі Пуціну не далі ўжо прысуджаную міжнародную нямецкую прэмію „Квадрыга" за палітычныя заслугі. Але нехта ж мусіць спыніць гэты маральны „беспредел". Знайшліся ў Германіі ў аргкамітэце людзі, якія прынцыпова выступілі супраць гэтага блюзнерства. А Вацлаў Гавел сваім парадкам паставіў заснавальнікам прэміі ўльтыматум — калі лаўрэатам стане расійскі прэм'ер, то былы чэшскі кіраўнік адмовіцца ад свайго аналагічнага ранейшага тытулу. Усё ж такі яшчэ не ўсіх і не ўсё ў гэтым свеце можна купіць.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Распусны план Ураборaса

Маё пісанне залежнае ад тытуню. Калісь, пасярод ночы, узлаваны нікацінавым голадам, таму і творчай немаччу, я сарваўся ад камп'ютара і так, як стаяў, пабег па папяросы ў тапках і старым, падзертым на локці, але ж улюбёным халаце. А была гэта позняя восень. Я жыў тады на падстрэшку камяніцы насупраць беластоцкай ратушы. Да начное крамы — рукой падаць! Толькі там, абсмеяны людзьмі, пабачыў я, што са мною робіцца. Я рашыў кінуць курэнне. І кінуў, ды з-за гэтага не мог пісаць. А я ж з пісання жыву. І я вярнуўся да шкоднай звычкі. Бо калі куру, тады пішу, а калі пішу, дык маю за што купіць папяросы. І так вось аказалася, што маё пісанне абапіраецца на старажытным міфе Ураборaса, вужа-цмока, які пажырае ўласны хвост. Прызнаюся, халерна балючая справа.

Пачаў я ад хваста, а трэба было зрабіць тое, як і належыць, ад галавы. Ёсць такі аповед, што некаторыя сярэднявечныя кафедры не мелі сваіх архітэктараў. Ніхто іх не праектаваў. Проста, збіраліся муляры і дойліды, і кожны з іх пачынаў будову, не звяртаючы ўвагі на тое, што робяць апошнія і не пераймаючыся нейкім агульным планам. У нейкі момант паказвалася ашаламляльная пабудова. Дарэчы, па такім прынцыпе ўзнікаюць мурашнікі ці капцы тэрмітаў. Мараль гэтага аповеду, калі яго правільна адчытаць, не прадбачвае дабра для нашай будучыні. Бо хоць сучасны свет, бачаны як вялікая пабудова, дзякуючы тэхналагічным здабыткам падняў кафедру чалавечых магчымасцей аж да зор, ды ці гэта не над мерку самога чалавека? Ці ягоны твор, выведзены з тэхналагічных гонак, а тыя — з пажаднага спажывецтва, не зваліцца пад сваім уласным цяжарам?

Мыючы калісьці вокны нью-йоркскіх хмарачосаў, хоцькі-няхоцькі я заглядаў у кватэры багатых амерыканцаў. З-пад ложкаў выліваліся патокамі рэчы больш і менш непатрэбныя, выробленыя ў Кітаі, Францыі, Японіі... Паслясезонны распродаж гэта для іх ідэалогія, уік-эндныя пакупкі — святочная ўрачыстая цырымонія. Над вуліцамі лунае малітва паднебных білбардаў: „Глядзі на мяне, захапіся, купі!..". Здурнелы тлум перавальваецца ад крамы ў краму, ад пятніцы да нядзелі і купляе. Пасля рэшту тыдня працуе, каб у выхадныя дні — дні куплі — расходаваць цяжка заробленыя грошы. Ці ж гэта не ідэя Ураборaса? Дзень да глабальнага эканамічнага правалу найбольш трапна, хоць не эмацыянальна, назваў гэты кумірны светапогляд адыходзіўшы прэзідэнт Буш: „Ратуйце Амерыку! Купляйце, купляйце, купляйце...".

Пабочным вынікам глабалізму, ініцыяванага ў саракавыя гады XX стагоддзя планам Маршала, з'яўляецца ідэалогія канзумерызму-спажывецтва. Яго сутнасцю з'яўляецца безупынная прапанова вырабаў. Так, якраз вырабаў, а не так, як калісь, прадметаў неабходнай патрэбы — рэчаў амаль суб'ектыўных праз працяглае і інтымнае суіснаванне з імі. Таму вырабам з'яўляецца кожны дэгуманізаваны прадмет, гаджэт. І не маю тут на думцы хутка выходзячых з моды чарговых мадэляў айподаў ці тэлевізараў. Возьмем для прыкладу звычайны гаршчок. У даўні час быў гэта прадмет дбайна дагляданы, латаны, адбельваны, са слязамі ў вачах перадаваны наступным пакаленням. Сёння ён стаў вытанчанай навінкай, гаджэтам, якім можна пахваліцца перад знаёмымі, а калі збрыдне, замяніць яго прыгажэйшым, быццам бы больш мадэрным. Ідэя гаджэта абапіраецца не на прыпісваных яго функцыі ўласцівасцях, а на патрэбе валодання ім. Так вось дзесяткі мільёнаў людзей працуюць над чарговымі версіямі гаджэтаў, а другіх столькі ж абдумвае новыя стратэгіі ўзбуджвання спажывецкай патрэбы валодання імі, а сотні, калі не мільярды пацее пры іх вырабах для таго, каб здзейсніць сваю патрэбу валодання тым, што вырабілі.

Вынікам глабалізацыі і спажывецтва з'яўляецца імпазантны тэхналагічны прагрэс. Толькі што паасобнаму чалавеку штораз цяжэй з гэтым справіцца. Але ж справа не ў паасобным і асобна недурным чалавеку, а ў мільярдах штораз больш бяздумных у сваёй узрастаючай масе чалавечых тэрмітаў. Зварухнутыя інстынктам будаўнікоў, ані не азіраючыся на іншых, ані не разумеючы чаму, уздымаем кранаючую неба кафедру. Абы толькі не па плане Ураборaса.

Міраслаў ГРЫКА

Вачыма еўрапейца

Чацвёртая Актава

— Лета — прыгожы, сонечны час на культуру з вялікай літары „к", — так падляшскі маршалак Яраслаў Дважанскі заахвочваў у час прэс-канферэнцыі да ўдзелу ў чацвёртым ужо выпуску Падляшскай актавы культур — Міжнародным фестывалі музыкі, мастацтва і фальклору. Ад 23 да 28 ліпеня ў гэтай адной з найважнейшых культурных падзей у рэгіёне прыме ўдзел больш за паўтысячы выканаўцаў з васьмі краін. У 19 мясцовасцях адбудзецца 27 канцэртных блокаў. Сёлета выступяць аж чатыры ансамблі з Беларусі. Паказвацца будуць вядомыя ўжо беластачанам „Белыя росы" з Гродна, гродзенскі „Тэатр Рада", Дзяржаўны акадэмічны народны хор Рэспублікі Беларусь імя Генадзя Цітовіча з Мінска ды мінскі Студэнцкі канцэртны ансамбль цымбалістаў з Дзяржаўнай Беларускай музычнай акадэміі „Лілія". Па-за Беластокам (пляц перад ратушшу) гэтыя калектывы выступяць у Бельску-Падляшскім („Белыя росы"), Нараўцы („Тэатр Рада"), Саколцы (хор імя Цітовіча), Супраслі („Лілія"), Васількаве („Тэатр Рада") і Тыкоціне („Лілія"). Фестываль будзе інаўгураваць у Беластоку ўжо традыцыйна парад калектываў (23 ліпеня; 16.30) з-пад каталіцкай кафедры пад прыратушны пляц.

У час прэс-канферэнцыі маршалак Дважанскі кінуў лозунг, які, на яго думку, павінен спадарожнічаць мерапрыемству: „Не рабем палітыкі, слухайма музыку!".

Прызнаўся, што ягоным найбольш улюбёным гуртом, які дагэтуль паяўляўся на Актаве і які заспявае і затанцуе таксама сёлета, з'яўляецца беларускі „Тэатр Рада". Сёлета гэтая група прадставіць песні і танцы казацкіх традыцый у Беларусі, Расіі.

— У мінулым годзе я не мог пабачыць гэты ансамбль у Беластоку. Таму паехаў я спецыяльна ў Монькі, дзе гэты ансамбль таксама выступаў.

У сваю чаргу дырэктар фестывалю Анджэй Дырдал, дырэктар Ваяводскага асяродка анімацыі культуры (галоўнага арганізатара імпрэзы) сказаў журналістам:

— Можна будзе паслухаць не толькі народнай музыкі, але і інспіраванай такой музыкай. Ідэяй фестывалю, апрача мастацкіх мэт, з'яўляецца стварэнне плошчы, каб выканаўцы з гэтых краін пазнаёміліся адны з аднымі.

Этнограф Зугмунт Цясельскі, старшыня Міжнароднай мастацкай рады фестывалю (з беларускага боку ў гэтай Радзе засядае аніматар культуры Ігар Лукашук, прадстаўнік Звязу беларускай моладзі), пераконваў:

— Гэты фестываль спалучае шмат культур. Культура агулам мае вытокі ў народнай культуры. Падляшскае ваяводства ад пачатку існавала на стыку беларускай, украінскай, літоўскай і польскай культур. Гэта для Еўрасаюза ўзор суіснавання.

Культуры пералічаныя старшынёй Цясельскім у час сёлетняй Актавы сутыкнуцца з культурамі Славакіі, Сербіі і Індыі.

— Падляшская актава культур ад пачатку ставіла сабе за мэту асвойванне іншасці, талерантнасць, радаснае суіснаванне нават значна адрозных культур, — дадаў Зыгмунт Цясельскі.

Ва ўступным слове выдадзенага пры нагодзе фестывалю каталога адзначыў: „Сучасны свет шукае спакою, укаранення ў традыцыі, але і прэзентацыі ўласных лакальных адметнасцей і здабыткаў".

Найлепшыя калектывы, якія выступяць у час Актавы, будуць узнагароджаны. Сваю спецыяльную ўзнагароду прызначыць таксама дэпутат Роберт Тышкевіч, намеснік старшыні сеймавай камісіі замежных спраў, старшыня парламенцкай групы па справах Беларусі. Мае ён узнагародзіць адну з беларускіх груп.

На жаль, болькай часткі публічнасці сёлетняй Актавы могуць аказацца канкурэнтныя імпрэзы. У першыя яе дні адбудзецца, між іншым, папулярнае „Басовішча". Ды што ж: усё да выбару, да колеру!

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Уявы роднай Еўропы

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

У рамках „Еўрапейскай агоры", мерапрыемства сарганізаванага з нагоды сотых угодкаў з дня нараджэння Чэслава Мілаша, і напярэдадні польскага старшынства ў ЕС, два дні ў сейненскай Белай сінагозе прадстаўнікі свету літаратуры і філасофіі абмяркоўвалі творчасць польскага лаўрэата Нобелеўскай прэміі і становішча Еўропы. Лозунг гэтага сімпозіума („Уявы роднай Еўропы") спасылаўся на зборнік эсэ Чэслава Мілаша „Родная Еўропа", які быў выдадзены ў эміграцыі напрыканцы пяцідзесятых гадоў мінулага стагоддзя.

Як прыгадаў Кшыштаф Чыжэўскі, дырэктар Асяродка „Пагранічча — мастацтваў, культур і народаў", арганізатар „Еўрапейскай агоры", „Родную Еўропу" пераклалі да гэтага часу на шаснаццаць моў. Ранняй восенню мае яна паказацца па-беларуску. Гісторык ідэі праф. Аляксандр Шэнкер з Нью-Хейвена, шматгадовы выкладчык аднаго з прэстыжных ВНУ — Йельскага ўніверсітэта, аўтар уступнага слова да першага выдання творчасці Чэслава Мілаша ў ЗША (1977 г.) гаварыў пра „Родную Еўропу":

— Мілаш не даходзіць у гэтай кнізе да сутнасці справы. Не характарызуе яго ані еднасць часу, ані месца. Лучыць яе асоба, значыць, сам Мілаш. Ён зацікаўлены абрысоўваннем контурам. Нават калі піша толькі пра сябе, няма гарантыі аб'ектыўнасці. Маем тут дачыненне з селектыўнай біяграфіяй усходняга еўрапейца.

Успамінаючы аб адным эсе з кнігі („Расія") праф. Шэнкер паставіў тэзіс:

— Мне здаецца, што Мілаш прылічваў Расію да Еўропы. Захад не быў і не ёсць прыхільным прылічэнню Расіі да еўрапейскіх краін. Сама Расія не ўпэўненая ў сваёй культурнай прыналежнасці.

Спаслаўся таксама на блізкае прыватнае знаёмства з лаўрэатам Нобелеўскай прэміі. На здзіўленне некаторых слухачоў, заявіў:

— Я ніколі не быў сапраўдным сябрам Мілаша. Сяброўства патрабуе абмену думкамі, зацікаўлення тым, што робіць другая асоба. У Мілаша адчуваў я вялікую неахвоту дзяліцца сабою, схільнасць да надзявання масак.

Калі прафесар расказваў аб сваёй дзейнасці па папулярызацыі ў ЗША творчасці пазнейшага лаўрэата Нобелеўскай прэміі, яго голас заламаўся:

— Мушу сказаць сумленна, што я рабіў гэта дзеля сябе самога. Мілаш меў свядомасць сваёй уласнай важкасці. У час вайны ведаў, што не будучы на баку расіян, а прыступаючы да Арміі Краёвай, можа быць забіты. Ведаў, што жывы можа больш зрабіць для літаратуры, чым нябожчык. Варшаўскае паўстанне было вялікай памылкай. Гэта было злачынства. Гэта было пасланне моладзі на немінуючую згубу і на вынішчэнне інтэлігенцыі Сталіным. Сталін хацеў, каб палякі гінулі пад Монтэ-Касіна. Катынь быў толькі адным са сталінскіх раздзелаў.

Ежы Ільг, галоўны рэдактар выдавецтва „Знак", у сваю чаргу пераконваў:

— Мілаш меў дар, які спрычыняўся да таго, што ведаў пра тое, што мусіць адбыцца. Не была гэта, аднак, веда, якую мелі ўсе навукола. Ведаў, што ягоны свет анахранічны, што ўжо наканаваны яму канец.

Гісторык і крытык літаратуры Аляксандр Фют:

— Цяжка намеціць межы Еўропы, не толькі з-за Расіі, але перш за ўсё з-за нашай ментальнасці. „Родная Еўропа" вельмі актуальная. Мілаш піша, напрыклад, што мы каланізавалі Літву разам з крыжакамі. Калі піша пра Еўропу, піша аб праблемнай разнароднасці.

Ірэна Грудзінска-Грос

Паэт Адам Загаеўскі:

— Мілаш не меў дакладнай уявы, што будзе і што рабіць.

Кшыштаф Чыжэўскі:

— Мы з „Роднай Еўропы" даведаліся пра тое, якімі мы ёсць.

Гісторык праф. Эгідыюс Аляксандравічус з Коўна:

— У Мілаша можна прачытаць пра страчаныя дамы і зменены памяці. Ён шукае сваёй асабістай памяці сярод вялікіх нацыянальнасцей. Калі я сустрэўся з Мілашам, ён гаварыў толькі пра сваё паходжанне, у якім шукаў сваёй тоеснасці. Жыў і дзейнічаў так, быцам было гэта апошні раз. Можа таксама гуляў гэтым сваім апошнім грамадзянствам Вялікага Княства Літоўскага. Упарты індывідуалізм з маральнай пільнасцю — шанц для чалавека з ліберальнай ментальнасцю.

Гісторык літаратуры праф. Анджэй Мэнцвэль пытаўся:

— Ці польская літаратура гэта літаратура напісаная па-польску, ці пісаная ў Польшчы? Ці яўрэйская літаратура, пісаная ў ідыш у Польшчы ў XIX ст., належыць да польскай культуры? Нельга гаварыць пра Польскае Каралеўства і Польшчу Ягелонаў, бо гэта выключаецца. У некаторых нашых асяроддзях не прымяняем паняцця „крэсы", толькі „пагранічча". Справы Ягелонскай Польшчы не ўдасца працягваць. Можна, аднак, яе ўзнавіць, ды ў іншым кантэксце.

Барбара Тарунчык, кіраўнік прэстыжнага часопіса „Zeszyty Literackie":

— Мілаш шукаў адказу ў гістарычных катастрофах. Крытыкаваў цывілізацыю еўрапейскага Усходу м.інш. за апатыю. У Расіі ганьбіў вернападданства, культ улады і непавагу да інтэлекту. Аналізаваў кожны крок і кожнае перажыванне. Трактаваў свой лёс па-філасофску. Умеў творча выкарыстаць свой гнеў на свет.

Леанідас Донскіс з Коўна, сябра Еўрапарламента:

— Мілаш паказаў правінцыялізм заходняй Еўропы з яе непрыязнасцю да ўсходняй Еўропы. Знішчаў простыя стэрэатыпы. Стаў проціяддзем на невуцтва. Цяпер памяняліся мы ролямі: заходняя Еўропа стала глабалізаванай сярэдняй Еўропай. Еўропа стала прытым саюзам небяспекі і фрустрацыі. Яе ментальную геаграфію неабходна актуалізаваць. Тэхналогія і камунікацыя апярэджваюць палітыку. Палітыка была б пустыняй, калі б адгарадзілася ад інтэлектуальных рухаў. Еўропу не апішаш вуснамі еўрапейскіх устаноў, палітыкаў. Палітыкам набходная пастаянная карэктура.

У час сімпозіума аб тым, што сталася з ідэяй еўрапейскай сям'і, ахопліваючай Літву, Украіну і Беларусь Чэслава Мілаша і Ежы Гедройца, таксама ўжо памерлага шэфа парыжскай „Культуры" (аднаго з цэнтраў еўрапейскай інтэлектуальнай думкі), спыталіся мы ў праф. Ірэны Грудзінскай-Грос з Нью-Йорка, гісторыка ідэі і літаратуры. Сказала нам:

— Гэтую ідэю не зразумелі. Перажываем цяжкі момант адраджання ідэі нацыянальнай дзяржавы ў этнічнай версіі. Ад таго тыя напругі, якія пачалі цяпер узрастаць. Да гэтага дайшло вызначэнне мяжы Еўрасаюза, значыць геаграфічнае вызначэнне мяжы Еўропы. Гэтая ідэя, аднак, у нейкім сэнсе ўдалася, бо людзі яе больш усведамляюць. З польскага боку не хапае нейкай уражлівасці на тое, як тая прыязнасць у адносінах да Украіны, Беларусі і Літвы мае выглядаць. Існуе сярод палякаў нейкае пачуццё вышэйшасці, недахоп уражлівасці на прымянянне некаторых тэрмінаў, напрыклад паняцця „крэсы". Прэзідэнт Браніслаў Камароўскі ў Краснагрудзе, адкрываючы Міжнародны цэнтр дыялогу [першы дзень „Еўрапейскай агоры" — М. Х.] выказаў тут тую ўражлівасць. Прымяніў паняцце Польшча Ягелонская. І не было гэта ідэалізаванне мінулага, а спасылка на будучыню краіны як шматнацыянальнай грамадскасці з раўнапраўем. У Ягелонскай Польшчы, аднак, свой гістарычны багаж. Тут трэба была б новая мова. І павінна быць гэта грамадзянская мова. Грамадзянска-сусветная, а не грамадзянска-этнічная, нацыянальная. Адраджэнне нацыянальных дзяржаў не здзіўляе, што вельмі добра відаць у Польшчы, з-за пачуцця крыўд, з-за таго, што некаторыя заяўляюць, што ёсць дзве Польшчы. Такая мова павінна была прапасці.

— ***А як спалучыць ахвоту збліжэння г.зв. дэмакратычных беларусаў да Еўропы пры адначасовай празе адбудавання ўласнай беларускасці, зрусіфікаванай нацыянальнасці?***

— Мне здаецца, што ўся канцэпцыя задзіночанай Еўропы, Еўрасаюза, абапіраецца на памылцы. Гэтая памылка заключаецца ў тым, што членамі ЕС з'яўляюцца дзяржавы і каб быць членам гэтай супольнасці, трэба быць дзяржавай. Дарэчы, гэта была адна з прычын распаду югаслаўскай федэрацыі. Кожны рашыў выбіцца на ўласную нацыянальную дзяржаву і такім чынам стаць паўнапраўным членам Еўропы. Я ўпэўнена, што беларусы адчуваюць патрэбу, каб спачатку збудавацца як моцны суб'ект і толькі тады ўключыцца ў Еўрасаюз.

— ***Як у гэтым кантэксце трактаваць Саюз Беларусі і Расіі?***

— Успамінаючы аб гэтым саюзе, знаходзімся на потскаланіяльным, постімперыяльным абшары, можа нават яшчэ імперыяльным, хоць галоўным чынам каланіяльным У імперыі абавязвае не этнічнасць, а грамадзянства. Гэтыя абшары былі каланізаваныя без прызнання ў нейкім сэнсе грамадзянства ці раўнапраўя. Гэтыя беларуска-расійскія адносіны — адрэагоўванне траўмы. Ёсць людзі, якія хочуць быць часткай гэтага большага арганізма, што ім мае даць пачуццё бяспекі.

— ***Як выйсці з посткаланіялізму?***

— Найважнейшае: зразумець, на чым гэта абапіраецца, а ніхто не сказаў, што разумеем гэта мы. Трэба заўжды старацца паняць, адкуль бяруцца трывожныя з'явы. Толькі тады будзе вядома, што з імі зрабіць. Перамагчы гэтага не ўдасца. Толькі зразумеўшы, якое грамадзянства тут магчымае, можна з гэтага выйсці. Зразумець, ці фактычна трэба адбудоўваць нацыянальную дзяржаву. А калі трэба яе адбудаваць, дык якой цаной. Нацыянальная дзяржава — атрутная. А з другога боку стаіць пытанне які магчымы палітычны гарызонт, калі не шляхам нацыянальнай дзяржавы, па-за саюзам з Расіяй, які менш прыцягальны чым будаванне нацыянальнай дзяржавы?

— ***А ці мае для Еўропы нейкае значэнне ўзрастаючая неахвота афіцыйнай Беларусі напр. да ўдзелу ва Усходнім партнёрстве?***

— А ці беларусаў не знеахвоціў да Усходняга партнёрства патэрналізм, які прыходзіць з гэтага боку Еўропы? Ці лёгка быць малодшым братам пры патэрналістычных стасунках?

— ***Ну добра, але ж ці расійскі патэрналізм у адносінах да Беларусі лепшы ад таго заходнееўрапейскага?***

— Вядома, не. Ды той стары патэрналізм — гэта ўжо прывычка, з якой чалавек ужо звыкся. Я ўжо стамілася гаварыць пра лепшую і горшую Еўропу. Няма ўжо сітуацыі, якая была калісьці, калі меркавалася, што тут цывілізацыя ёсць, а там яе няма. Кончылася вышэйшасць французскай ці брытанскай культуры. Ведаюць пра гэта французы ці брытанцы. Толькі мы ўсё яшчэ паўтараем: мы не горшыя, мы не горшыя.

Ад польскай пракуратуры патрабуюць пакараць вінаватых у знявазе беларускага сцяга

12 ліпеня ў генеральную пракуратуру Польшчы паступіла заява аб здзяйсненні злачынства ў адносінах да групы беларусаў на матчы чэмпіяната Еўропы па баскетболе сярод жанчын у Быдгашчы.

Заяву занёс Ігар Шчэкарэвіч — адзін з пацярпелых на матчы беларусаў. Ігар абвінавачвае ахову матча і арганізатараў у знявазе беларускага нацыянальнага сімвала і парушэнні яго асабістай недатыкальнасці.

Ігар Шчэкарэвіч: „Я быў у судовага лекара, які зафіксаваў у мяне сінякі па правай руцэ. Гэта вынік таго, што ахова вынесла мяне з залы з ужываннем сілы. Ні ахова, ні арганізатары матча да гэтага часу не выбачыліся перад беларусамі за знявагу беларускага сцяга. Гэта зрабілі толькі ўлады Быдгашчы. Перад тым як занесці заяву я чакаў амаль 3 тыдні на выбачэнні. Але відавочна тыя асобы, якія здзейснілі злачынства, лічаць нармальнай справай знявагу беларускіх нацыянальных сімвалаў. Таму трэба выкарыстоўваць прававыя нормы для пакарання гэтых асоб. Хачу падзякаваць за юрыдычную дапамогу праваабаронцу Андрэя Жукаўца і ўкраінскаму Цэнтру „Супрацоўніцтва без межаў".

Нагадаем, што ўвечары 25 чэрвеня група беларускіх заўзятараў была выдалена з матча Беларусь — Літва на чэмпіянаце Еўропы па баскетболе сярод жанчын у польскім горадзе Быдгашч. Пры гэтым супраць Ігара Шчэкарэвіча ахова ўжыла сілу. Прычынай выдалення беларусаў стала іх адмова згарнуць бел-чырвона-белыя сцягі.

Прэс-служба Цэнтра рэгіянальнага развіцця „Супрацоўніцтва без межаў"

Прыемная крама

Мне часта прыходзіцца рабіць пакупкі ў краме „Маркет" у Беластоку па вуліцы Пілсудскага, 29 (каля кругавой развязкі на пляцы Люсы). Тут вялікі выбар прадуктаў. Я часта тут купляю смачныя салаты. Салатаў шмат, на розны смак, усе хатняга вырабу. Абслуга ў краме спраўная, хуткая, вельмі ветлівыя прадаўшчыцы. Заходзьце!

Жэня Мартынюк



Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

СТРАЖНІК З БАНДАРОЎ

На зялёным, уквечаным падворку ў Бандарах сядзіць немалады гаспадар, Клаўдзік Казбярук: — Ой, цяпер то мне было цешыцца жыццём, калі б не здароўе!

І што яму раптам успамінаецца?

Сядзеў у другім класе за тое, што растлумачыў што такое СССР!

— Была лінейка ў школе. Падбег да мяне Палітрук з указкай: „Мерзавец! Прывядзі бацьку ў школу". А ў той час бацька быў у радзе. „Сынку, то ты не ідзі ў школу", — сказаў тата. І я не пайшоў. Мне адразу „справаванне" зменшылі. І калі дастаў я пасведчанне, парваў яго і на клямцы павесіў. І так жулікам застаўся. А бо якраз „Бацько памёр!" Сагналі нас на тую лінейку, каб суперажываць з нагоды смерці Сталіна. Нам да смерці „бацькі" нічога не было, мы гулялі, гоцалі, крычалі, дык Палітрук прыйшоў з лінейкай нас супакоіць. Пытаецца: што такое ПАРП,

што такое СССР.

Адзін пераростак падказаў. „Як, як гаворыш?". Шапнуў мне: „Кажы: Сталін Сраў Сырою Рыбаю!" і сам гоп праз акно. Так я і сказаў дырэктару. І захадзіла тая лінейка па руках, па галовах! Пацяў усім твары. Мой бацька кажа: „Я да дурня не пайду!". На Палітрука — дурань?! А тата ж быў у радзе, якая памагла нам сцягнуць рэпатрыянта, нашага далёкага сваяка з Ціхаволі. Карэтчыха была наша далейшая сям'я. Мы Карэткаў сцягнулі да сябе, каб на нас менш зямлі было, бо ўжо нашу сям'ю прызначылі да вывазкі за „кулацтва". Касілі мы свой луг за Нарвай, то нам казалі лучане: „Апошні раз косіце, чакаюць вас белыя мядзведзі". Той луг наш усё жыццё звалі „Казбэручковым". А Карэтка быў мяснік, першую жонку яму забілі, двое меў дзяцей. Філіп Карэтка быў мяснік, і гандляр, і „доктар" — між іншым сэрцы лячыў. У кадастравай кнізе ўся зямля засталася на майго дзеда, аддзялілі мы Карэтку кавалак, каб жыў. Хоць хто там думаў пра натарыуса. Жылі Карэткі побач нас, ды ніколі за нішто не плацілі. Цяпер па іх дзвесце тысяч даўгоў. Патомкі Карэткі цяпер хацелі б і вярнуцца на зямлю, ды не могуць. Я апошні спадчыннік, магу і аддаць зямлю гміне, ды баюся, што паселяць у пустой хаце такіх самых. Хоць патомкі Карэткі ў парадку — лясніччы, двух магістраў, адзін эколаг. Стары быў проста тут як кватарант, плаціў, праўда, час ад часу падатак, бо ўсё наракаў і патрабаваў ільгот. *Панства*, гміна крыху праз пальцы глядзела, бо то рэпатрыянт, то цяжка яму прыжыцца. Філіп быў „доктар", ногі складаў, правяраў ціск, выпісваў лякарствы. Усё батрачыў як не на сваім. Мне было гадоў 12 гадоў, як памёр. І не пакінуў Філіп Карэтка паперaў, што ўласнасць меў тых гектараў. Зямлю тую патомкі Філіпа былі кінулі, перасталі цікавіцца і домам. Цяпер, калі зямля тут у цане золата, пачалі дабівацца, каб забраць. Прапанавалі, каб я

аддаў з уласнай волі,

дык мне дадуць за іх дзесьці каля Юшкавага Груда кавалак — за гектар давалі тры. Пасля, кажуць, усё забяруць, і пытацца не будуць. А я кажу: няма чаго спяшацца, заліеце ці не заліеце маю бацькаўшчыну — пабачым! І якраз не залілі. А з гэтага боку, ад Нарвы, прадавалі па 20 грошаў за метр, і я крыху дакупіў. Мог больш узяць, у гміне казалі: „Бяры, колькі хочаш, людзі кідаюць". Зямля гэта зямля. Купляюць участкі цяпер розныя людзі. І яны плануюць: тут і электрастанцыю збудаваць можна, і тонамі рыбу лавіць...

Заснавалі мы тут, грамадскім пачынам, супацьпажарную страж, у 1966 годзе. Першы атрад у Міхалоўскай гміне. Каб мець сваю святліцу. Разам з Колам вясковых гаспадынь. Перш мы заснавалі ансамбль. „Падтрымліваючыя сябры" — са скрыпкай Фёдар Хлябіч. Бубнач. Саліст Бура. Я — арганізатар. Паставілі ў Мельнікава дзве шафы-гукаўзмацняльнікі. Напісалі прашэнне.



Прышыкавалі баль. А тут жніво. Абед. Напісалі, што *зэспул* маем, трэба пісаць план дзейнасці. Трэба нам залу на дэпо. На дэпо прапанавалі нам нейкую шопку. Ды калі ўжо ансамбль ёсць, трэба залу. А паперы ўжо мы нарыхтавалі былі яшчэ ў 1960 годзе! І абсталяванне залы мы займелі, і пячаткі. І пішам ваяводскай камендатуры пажарнікаў:

Добраахвотная страж

у Бандарах просіць прадаць тэхнічную дакументацыю на пабудову пажарнага дэпо ў Рыбаках у грамадскім пачыне. Маем на гэтую мэту бюджэт 72 тысячы злотых. І вось спісак асоб забавязваючыхся да пабудовы рамізы ОСП у Рыбаках: Міруць Мікалай, Хлябіч Фёдар, Хлябічы Міхал, Яўгень, Мікалай і Аляксандр, Кічкайла Аляксандр, Баршчэўскі Ян, Чабан Тадэвуш, Бойка Уладзіслаў, Міруць Фёдар, Багнюк Ян, Лукша Віктар, Бура Мікалай, Ціванюк Кастусь, Пшылажынскі Яўген, Грыка Ян, Казбярук Мікалай, жыхары вёсак Рыбакі, Гарбары, Бандары, Багнюкі, Таніца-Верхняя і -Ніжняя. Пажарнікаў 22. Мяне выбралі начальнікам добраахвотнай каманды, зацвердзіў мяне палкоўнік Клім Дзярманскі. Было пажараў шмат у ваколіцах — у Лявонавічах, сорак хат згарэла, усё гарэла Лука, торф на Імшары. Ды і гулялі мы з вёскамі. Накупілі сталовай заставы, сталоў, крэсел, арганізавалі самадзейнасць, танцы. Купілі толь, шлак, блокі на сцены і перакрыцце — мелі магчымасць дабудаваць паверх над нашым дэпо. Ды справа развалілася, кінуў я свае пасведчанні, калі патрабавалі, каб я стаў членам партыі.

Адмовіўся,

я, інвалід, працаўнік, які займаў першае месца найлепшага ў гміне трактарыста. Адмовіўся і ў 1970 годзе страляць у страйкуючы тлум у Гданьску. Я быў на „вежычцы", на гарматцы. Гарэў Дом партыі ў Гданьску. Мы, перапранутыя ў міліцыйныя мундзіры, з двума самаходамі-бэтэрамі мелі блакаваць дарогу. Ідзе чалавек, трымае бутэльку з бензінам у кішэні, папяроса ў зубах, гумачку раз! — і кідае ў цябе тую бутэльку. Дзве-тры з усіх бакоў ляцяць, і ламы, і каменне, тратуар, трылінкі, вяроўкі... Дым, людзі, амаль нічога не відна. У гарматцы вострая амуніцыя, магу цык — і стрэліць. Страляў вострай амуніцыяй у верх і ў бакі, бо ж не мог я, салдат, селянін, страляць у брата. Пэўне, мог пусціць пару серый, змяло б усіх. Кінулі ў мяне кактэйлем Молатава. Выкінула мяне пару метраў далей, а БТР мяне пераехаў. Добра, што мяне людзі не разарвалі. Я не чуў болю. Трапіў у нейкую ямку, паміж цэглы, бо калі б тыя 7 тон мяне наехалі, раздушылі б. Можа, яшчэ людзі на мне нейкія ляжалі. У санітарцы апрытомнеў. Ніхто нагі нават не ўшчыльніў. Я высыпаў патроны пад ногі, адшпіліў свой эркаэм, і тою кардонкай ад патронаў нагу абкрунуў і паскам ад карабіна абвязаў. Пакаралі мяне пасля за тое, што я патроны высыпаў і пасак ад карабіна адчапіў... Паўгода ляжаў я пасля ў паліклініцы... Калі б застаўся ў арміі, меў бы цяпер пенсію немалую. А то гнала дахаты. Далі мне рэнту па інваліднасці. А калі пасля я стаў рабіць, дык свае пісалі, даносілі, што я на рэнце працую.

Клаўдзік Казбярук перасыпае ў спрацаваных далонях дакументы з першых гадоў службы пажарнікаў. А там ляжаць яшчэ арыгінальныя дзядоўскія дакументы з гаспадаркі. Зараз яго пакліча на свой участак вядомы беластоцкі прадпрымальнік родам з-пад Крынак. За палеткам, якога не аддаў пад замену, пачынаецца „Бандарская гасцёўня". Найбольш там людзей з вёсак залітых Семяноўскім вадасховішчам. Усіх іх гісторыя цягала куды хацела, ды не кожнаму ўдалося так, як Клаўдзіку, ушчаперыцца за сваё.

Уладзімір СІДАРУК

Сябры застаюцца сябрамі

Гартаючы старонкі дамашняга фотаальбома, спаглядаю на здымкі сяброў, якія атрымаў я ад іх на памяць. Было гэта на зломе пяцідзесятых гадоў, калі я пачынаў грамадскую дзейнасць у грамадскіх арганізацыях — у Саюзе вясковай моладзі (ЗМВ), БГКТ і Лізе сяброў салдат (ЛПЖ).

У Кузаве я лічыўся важаком мастацкага калектыву. Паколькі не хапала сцэнічных твораў для драмгуртка і тэкстаў песень, напісаў я ліст у часопіс „Пшыязьнь", што хачу перапісвацца з моладдзю на тэму культурна-асветнай працы на вёсках і абменьвацца паштоўкамі, фотаздымкамі кіназорак, маркамі і песнямі. На вынік не прыйшлося доўга чакаць. Неўзабаве пачала паступаць пошта. Пісьманосец, а быў ім тады пляменнік Толік Фралоў (памёр сёлета ў Гайнаўчы. Няхай Яму зямля пухам будзе!), амаль штодзень прыносіў лісты з усіх бакоў краіны ды Савецкага Саюза. Асабліва захапляла мяне карэспандэнцыя з савецкімі студэнтамі, якія пасылалі мне маркі і фотаздымкі кіназорак, зборнікі песень. Шмат гэтага было. Сувеніры захоўваў я гадамі, пасля перадаў іх дочкам, калі падраслі. Фатаграфіі сяброў пакінуў я сабе на добры ўспамін і зберагаю па сённяшні дзень як рэліквію. Запамятаўся адзін надпіс на адвароце здымка. Аляксандр Максімюк з Вілінава (служыў тады ў войску ў Зялёнай Гуры) так напісаў на сваёй фатаграфіі: „Вспомнишь — спасибо, забудешь — не диво, в жизни бывает и так".

Барыслаў Зуеўскі: «На память Владимиру от Бориса, как белорусу от белоруса — 29 октября 1960 г. г. Москва»

Барыс Сарокін: «Дорогому другу Владимиру от Бориса 16 II 59 г. г. Москва»

Я не забыў сяброў маладосці. Пра Аляксандра Максімюка распытваў пры нагодзе пабыўкі ў Вілінаве на Дзень сеніёра. Мае суразмоўцы з гурту „Верасы" пачаткова не маглі ўспомніць каго тычыцца справа, але пазней сказалі, што майго калегі ў Вілінаве няма. Ён перасяліўся ў Беласток, працаваў шафёрам. Па іхняй думцы, ён зараз інвалід...

Успомніліся мне савецкія сябры, асабліва два маскоўскія студэнты: Барыс Сарокін і Барыслаў Зуеўскі. Памятаю, што Сарокін пражываў па адрасе: Масква, Харашоўскае шасе, дом 80/84 кв. 45. Гэта быў самы лепшы сябра па перапісцы. З ім мы абменьваліся лістамі больш дзесяці гадоў. На жаль, не захаваўся адрас Барыслава Зуеўскага. Памятаю адно, што родам ён з Беларусі. На ягоным здымку захаваўся такі надпіс: «На память Владимиру от Бориса, как белорусу от белоруса — 29 октября 1960 г. г. Москва».

Калі ўспамінаю маладосць, перад вачыма паўстаюць вобразы маіх сяброўак і сяброў па перапісцы. Гэта ж было паўвека таму назад. Рад быў бы я зараз аднавіць наша знаёмства. Дзе ж вы цяпер шаноўныя калегі?..

Летнія заняткі беларускіх студэнтаў у Седльцах

Тэкст і фота Адама БОБРЫКА

У Прыродазнаўча-гуманітарны ўніверсітэт у Седльцах прыехала 14 студэнтаў з Брэста і Мінска. На працягу трох тыдняў будуць яны ўдзельнічаць у занятках XIV Летняй школы польскай мовы і культуры. Як адзначыла д-р Беата Валенцюк-Дайнека, праграма накіравана на павышэнне моўных навыкаў і азнаямленне са штодзённым жыццём Польшчы. „Мы хочам таксама, каб яны добра бавілі час. Таму мы арганізуем серыю музычных, літаратурных, турыстычных падзей. Наша галоўная адукацыйная мэта — вывучэнне польскай мовы, а гэта часта дасягаем нетрадыцыйнымі метадамі", — сказала яна. У студэнтаў шмат сустрэч і падзей, у якіх яны актыўна ўдзельнічаюць. Прэзідэнт горада Седльцы Войцех Кудэльскі заахвочваў беларускую моладзь да ўстанаўлення больш цесных кантактаў са сваімі аднагодкамі і да больш частых візітаў. Ён падкрэсліў, што самы кароткі шлях на Захад праходзіць менавіта праз Седльцы.

Беларуская моладзь выказала як найлепшае меркаванне аб занятках і пануючай на іх атмасферы. Станіслаў Гецальд з Брэста падкрэсліў, што ён ужо тут другі раз таму, што ён моцна любіць Седльцы. „У нас ёсць апекуны, якія заўсёды з намі, памагаюць нам, пераказваюць рознымі формамі веды. Гэта вельмі карысна для маёй будучай прафесійнай кар'еры. Мы блізкія суседзі. У нас вельмі шмат палякаў. Добра тады ведаць мову і культуру сваіх суседзяў". Падобнае меркаванне выказала Вікторыя Занко, таксама з Брэста. Яна асаблівую ўвагу звярнула на іншы стыль выкладання. „Я думала, што мы будзем зубрыць словы і граматыку, а тут нас сустрэў сюрпрыз. Мы вучымся, і гэта дае нам задавальненне. Польская мова мне вельмі падабаецца, і я думаю, што дапаможа мне ў маім жыцці".

Арганізацыя летніх школ мовы і культуры з'яўляецца добрай традыцыяй, якая садзейнічае прамоцыі краіны. Іх значэнне значна большае, чым проста пашырэнне кола людзей, якія карыстаюцца дадзенай мовай. Гэта перш за ўсё новы вопыт для маладых людзей, ломка стэрэатыпаў, удасканальванне кваліфікацый, пашырэнне кампетэнцый прыдатных на рынку працы. Польшча і Беларусь не толькі суседнія краіны. Абедзве краіны маюць значныя супольнасці этнічных меншасцей. Веданне мовы суседзяў гэта часта неабходнасць у штодзённым жыцці. Беларуская моладзь адкрытая на свет, і сёння, удзельнічаючы ў такіх адукацыйных ініцыятывах, не толькі інвестуе ў сваю будучыню, але і ў сваю краіну. Польшча такім чынам здабывае новых сяброў у Беларусі.

Найлепшыя скульптары

15 чэрвеня г.г. у самаўрадавай святліцы ў Старым Ляўкове (Гайнаўскі павет) арганізавалі V Гмінны скульптурны конкурс. Скульптуры ляпілі з высакаякаснай гліны, якой поўна ў ляўкоўскім наваколлі.

У конкурсе ўдзельнічалі дзеці, моладзь і дарослыя з Нараўчанскай і Чыжоўскай гмін. Былі зубры, зайчыкі, вавёркі, вожыкі, птушкі ў гнёздах, рыбкі, грыбы, домікі, дэкаратыўныя падсвечнікі, ружы, кубкі, званочкі...

І так, у катэгорыі дзяцей у дашкольным узросце першае месца заняла Габрыела Рэдзька, другое — Караліна Лукасік ды трэцяе — Магдаліна Лясота і Якуб Карпюк.

У катэгорыі дзяцей ад 8 да 10 гадоў лаўрэаткай стала Караліна Каравай, другое раўнапраўнае месца занялі Крыстына Леўша і Кацярына Стульгіс ды трэцяе — Караліна Барэчка і Уршуля Марчук.

У катэгорыі дзяцей ва ўзросце ад 11 да 13 гадоў перамагла Эмануэля Міраноўіч, другое раўнапраўнае месца занялі Анна Якімюк і Наталля Карпюк ды трэцяе раўнапраўнае месца — Рафал Марчук, Паўліна Драўноўская, Магдаліна Стоцкая і Наталля Дмітрук.

У катэгорыі гімназістаў першынство заваявалі Паўліна Гаўрылюк, Кшыштаф Ляткоўскі і Магдаліна Сухадола, другое месца заняла Каміля Лукасік ды трэцяе раўнапраўнае месца — Наталля Харкевіч, Эва Саковіч і Дарак Мазаноўскі.

У групе дарослых асоб журы прызначыла ўзнагароды Анне Лукасік (I месца), Мажэне Лукша (II месца), Тэрэзе Саковіч (III месца) і Іаанне Харкевіч (IV месца).

Удзельнікі былі задаволены дыпломамі (яны вельмі прыгожыя) і рэчавымі ўзнагародамі, пра якія паклапацілася дырэктарка Гміннага асяродка культуры ў Нараўцы Анна Стульгіс. У падрыхтоўцы і ў ходзе конкурсу шмат папрацавалі Вольга Максімюк (інструктар мастацтва, шэф скульптурнай майстэрні), Галена-Марыёля Рэент (кіраўнік стараляўкоўскай святліцы), Юрка Равінскі (радны Нараўчанскай гміны, член журы, фатограф), Ядвіга Карпюк (старшыня журы, рэдактарка часопіса „Над Нараўкай") і Аліна Барташук (кіраўнік ляўкоўскай бібліятэкі, член журы).

Янка ЦЕЛУШЭЦКІ

Завяршыўся конкурс

Чаромхаўскія школы штогод удзельнічаюць у акцыі збірання другаснай сыравіны. Гміна аб'яўляе конкурс, а школы набіраюць балы. Сёлета ў Пачатковай школе ў акцыі ўдзельнічала дваццаць шэсць вучняў, якія здалі 17 855 алюмініевых банак, 45 283 штук пластмасавай упакоўкі, 3 818 кг макулатуры і 146 мяшкоў шклатары. У конкурсе ўдзельнічала таксама шэсць гімназістаў, якія здалі 6 395 алюмініевых банак, 5 486 штук пластмасавай упакоўкі, 60 кг макулатуры і 12 мяшкоў шклатары.

Лідарам конкурсу стаў пяцікласнік Матэвуш Высоцкі, які набраў 8 274 балы, II месца заняў яго аднакласнік Пшэмыслаў Дудэлевіч з 6 277 баламі, III месца прыпала Адрыяну Каліноўскаму — вучню II класа Гімназіі, які набраў 5 162 пункты.

Пераможца атрымаў лічбавы фотаапарат, а лаўрэаты II і III месца — кансолі з MP5 плэерам.

(ус)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі

Я бачу свет як карціны

Інтэрв'ю з Касяй Сянкевіч, аўтаркай зборніка „Дачка ружы", студэнткай факультэта мастацтва Люблінскага ўніверсітэта імя Марыі Кюры-Складоўскай.

30 чэрвеня г.г. адбылася першая прэзентацыя зобрніка „Дачка ружы". Сустрэчу мы наладзілі ў мастацкай галерэі імя Тамары Саланевіч у Нараўцы ў час XXV Сустрэч „Зоркі".

Індывід: *— Як Ты адважылася выслаць свае вершы на конкурс „Дэбют"?*

Кася Сянкевіч: — Мяне заахвоціла настаўніца беларускай мовы Ніна Абрамюк з Нарвы. Гэта быў мой першы сур'ёзны конкурс.

Індывід: *— А пасля Ты рашылася паказаць свае вершы ў Літаб'яднанні „Белавежа"?*

КС: — Гэта адбылося так хутка, што мне было цяжка ва ўсё паверыць. А найбольш, што магу сядзець сярод вядомых творчых людзей.

Індывід: *— Што падштурхоўвае Цябе пісаць вершы?*

КС: — Пішу, калі хачу вызваліць свае пачуцці.

Індывід: *— Ці тое, што Ты — мастачка, мае адлюстраванне ў Тваім бачанні свету?*

КС: — Так, вельмі моцна. Я бачу свет як карціны. І адразу думаю як гэта я магла б намаляваць.

Фота Ганны Кандрацюк

Кася Сянкевіч у цэнтры

Індывід: *— Як пачалося Тваё сяброўства з беларускай мовай?*

КС: — Яно з пачатковай школы. Пасля, калі я вучылася ў мастацкім ліцэі ў Супраслі, і там не было магчымасці вывучаць родную мову, я не парвала з мовай. Вершы ў зборніку датычаць супрасльскага перыяду.

Індывід: *— Ці Ты падобная да гераінь сваіх вершаў?*

КС: — Мае вершы гэта я. Я пішу вершы пра свае пачуцці.

Індывід: *— Якія ў Цябе планы ў мастацтве і літаратуры?*

КС: — У мяне вельмі многа планаў. Адным з іх з'яўляецца вучоба ў мастацкай акадэміі. А што датычыць літаратуры? Хачу пісаць больш вясёлыя вершы, каб паказаць людзям прыгажосць свету.

Апрацавалі: **Дарка Вапа**, Гімназія № 7 у Беластоку і **Кінга Бадавец**, Белгімназія ў Бельску-Падляшскім

Музыка жыцця

Музыка — вельмі важная справа ў жыцці чалавека. Яна нас стварае, гэта ад яе залежыць якімі людзьмі мы будзем. Вядома, ёсць вельмі многа розных жанраў музыкі, аднак на густ і колер таварышаў няма. Многія ўдзельнікі XXV Сустрэч сябруюць з музыкай. Тут асобы, якія іграюць на такіх інструментах як фартэпіяна, акардэон, флейта, клавішныя інструменты, гітара. Некаторыя з іх, напрыклад Лукаш Філіпюк, маюць ужо міжнародныя поспехі. Ёсць і такія, што спяваюць у розных калектывах і харах. Вядома, што ў наш час ужо наймалодшыя гадзінамі сядзяць з носам у камп'ютарах і тэлевізарах. У іх ніколі няма часу.



Малюнак Лукаша Філіпюка

У крузе сяброў-сустрэчнікаў думаюць інакш. Многія з нас ходзяць дадаткова яшчэ і ў музычныя школы. Музыку трэба адчуваць не толькі вушамі, але і душой. Мяне вельмі цешыць, што ёсць моладзь, якая мае многія зацікаўленні. Мы будзем дасканаліцца ў творчым плане і заўсёды адзначаць, што мы — беларусы. Я ведаю, што, дзякуючы нам, наш народ не загіне. Магчыма, нашыя сябры стануць вялікімі людзьмі і я буду ганарыцца, што яны былі ў крузе маіх сяброў.

Уля Беразавец, *Небасклон,* Гімназія ў Нарве

Фота Ганны Кандрацюк

Паўліна Ваўранюк і Іаанна Марко

Ці бачыш як цярпіць рака?

Вадасховішча Семяноўка ўзнікла ў другой палове XX стагоддзя на Падляшшы. Многія з нас думаюць: навошта яно нам? Паводле мяне, гэта страта грошай і цярпенне ракі Нарвы. Амаль уся вада са штучнага возера — з ракі. З-за гэтага яна памянялася і стала малой, бруднай і хворай рэчкай. Калісь было інакш. Нарву лічылі магутнай, але лагоднай ракой. Ёсць нават легенда пра тое, што ў Нарве ніколі не заводзіліся ядавітыя вужы. У нетрах жыло шмат рыб і раслін. Людзі любілі выходзіць на бераг і спяваць вадзе песні...

Зараз наша рака наклікае сумныя думкі. Глядзіш на яе і адчуваеш яе цярпенне.

Паўліна Ваўранюк, *Індывід,* Гімназія ў Нарве

Фельетон атрымаў вылучэнне за ўражлівы погляд на цярпенне прыроды.

Па паверхні неба

Па паверхні неба воблакі
прасоўваюць дрэвы
маладая дзяўчынка душы
плыве адной хмарынкай
сам-насам у вялікім доме жыцця
дрыжаць ад думкі пра адсутнасць
тваіх вуснаў мелодыі

Кацярына Сянкевіч,
Небасклон, выпускніца Мастацкага ліцэя ў Супраслі

Малюнак Лукаша Філіпюка

Замест знічаў — камяні!

У Нараўцы перад вайною палову жыхароў складалі габрэі. Большасць з іх загінула ў час вайны, некаторыя з'ехалі ў Ізраіль або ў Амерыку.

Ад колішняга народа асталіся толькі могілкі, кіркут. На ўзгорку ў лесе, за каменным мурам-агароджай застаўся след у выглядзе старых мацэваў. Яны характэрныя для ашкеназійскіх габрэяў. Паводле традыцыі на мацэвах знаходзіліся імёны, прозвішчы, а таксама былі пералічаны добры ўчынкі пакойнікаў. Габрэі верылі, што розныя сімвалы маюць свой пераказ. Напрыклад, паламанае дрэва сімвалізуе асобу, якая раптоўна закончыла жыццё і не пакінула патомства. У наш час у Нараўку прыязджаюць нашчадкі тых, якім пашанцавала з'ехаць перад вайной у Амерыку. Яны знаходзяць магілы сваіх продкаў. Паводле габрэйскай традыцыі на мацэве замест знічаў кладуць камяні. Турбуе толькі адзін сакрэт. На некаторых панадворках жыхары Нараўкі знаходзяць старыя мацэвы. Аказваецца, што яны ляжалі ў зямлі або служылі ў якасці сходаў. На шчасце ёсць людзі, якія даглядаюць габрэйскія могілкі, бо ведаюць, што гэта апошні след габрэяў у іх мястэчку.

Фота Ганны Кандрацюк

З кіркутам знаёміць Кася Бяляўская

Фота Міхаліны Герасімюк

Дарка Вапа і Оля Конюх

Аляксандара КОНЮХ,
Небасклон,
вучаніца Гімназіі № 7 у Беластоку
Фельетон атрымаў вылучэнне за змест і важнасць праблемы.

Уладзімір Караткевіч

Чортаў скарб

(працяг з 27 н-ра)

Раніцаю ўсе ўсталі і падумалі, што гэта мядзведзь рэпу з'еў. Здзівіліся, што не пабаяўся лезці ў гарачую печ, і ўзрадаваліся, што з'еў зусім мала. Што ж, мядзведзь не першы і не апошні ў свеце адказваў за чужыя грахі.

Пасля ўсе даелі тое, што заставалася ў гаршку. Мядзведзь нават яшчэ паскакаў дзецям. І пайшлі яны з павадыром зноў, ад мястэчка да мястэчка, ад сяла да сяла. Пад сонцам і дажджом.

Тупу-тупу-тупу, Нясе Мішка ступу...

Але з таго часу чортава гарэзаванне як нажом адрэзала. Коні здаровыя, сажы ў капусце няма, на пірагах ніхто не адпачывае. У коміне, праўда, нехта часам вые і з падпечка часта нешта свеціць, але гэта ўжо цярпець можна. Раздумаў Янка кідаць сваю хату.

Толькі на гэтым гісторыя не скончылася, не думайце. Неяк пад восень араў Янка свой клін пад азіміну. Мокра, касы дождж, нізкія чорныя хмары. Аж бачыць, з-пад хмар, з самага акаёму, нехта ідзе да яго па раллі. Прыгледзеўся — ага, стары знаёмы, чорт.

Ідзе ўвесь мокры, як цуцык пад залевай. На кожным капыце па пуду гліны наліпла. Пад носам ад прастуды вісіць вялізная кропля. А насоўкі ж ён не мае. Як ты часам, калі дома забудзеш. А капытом не дужа высмаркаешся. Ідзе такі няшчасны, такі жаласны і ўбогі, што нават Янка яго пашкадаваў:

— Ты куды гэта?

— А так, — сказаў чорт. — У свет. — Памаўчалі. — Пасля чорт пытае:

— А скажы ты мне, ці ўсё яшчэ ў цябе тая кошка?

Янка быў чалавек не дужа мудры ды і не ведаў, пра якую кошку размова:

— А няго ж, — кажа. — Ясна, што ў мяне. Ды яшчэ і шасцёра кацянят прынесла.

— І ўсе ў матку?

— Ага. Усе пярэстыя, з чатырма лапамі, з адным хвастом.

— З лапамі, з лапамі, — сказаў чорт. — Даліся мне тыя лапы.

— Дальбог аж шасцёра!

— Ну, то я, мабыць, ніколі да цябе не прыйду, — уздыхнуў чорт. — А трэба было б. Дужа трэба.

— Гэта чаму?

— Ат! Закапаў я ў цябе ў падпеччы казан з золатам. Скарб. І трэба было б выкапаць, але як тваю кошку ўспомню — бр-р-р! — ну яго. Хай прападае.

— Ты, як зусім змерзнеш, прыходзь. Глядзіш, рэпу зварыш, дзяцей пакалышаш.

— Н-не. Кошкі баюся. А рэпы гэтай я цяпер да самай смерці ў вочы бачыць не магу.

Ды і пайшоў сабе полем, пад дождж, ледзь цягнучы пудовыя ногі. Такі гаротны, небарака.

(працяг будзе)

Музыка з кайфам

Гэта яны — „Бетоны"!

Мы — як зубры,
мы ў сябе дома,
тутэйшыя, што ад вякоў жывуць.
Мы — як дубы,
нас можна знішчыць громам,
але з зямлі нас роднай
не скрануць...

Ларыса Геніюш

Пад гэтым дэвізам дэбютаваў на беларускай мове гурт „Бетон" у мінулым годзе на фестывалі „Басовішча". І, хоць журы іх не вылучыла, сёлета будуць зноўку прэзентавацца, бо ўвесь год шмат працавалі і запрацавалі, відаць, на сімпатыю арганізатараў фестывалю.

Атрымалі яны нечакана вылучэнне на адным з андэрграўндных і маладых фестываляў у Супраслі — на фестывалі „Песні Кахання, Міру і Нянавісці". Дзякуючы ўзнагародзе, паехалі ў Кракаў як сапорт выдатнай фольк-каманды „Капэла з вёскі Варшава". А гэта за першы год сваёй дзейнасці. Неабыякавай. У гурце „Бетон" ажно сем асоб і ўжо толькі рэгулярныя рэпетыцыі можна ў іх выпадку палічыць вялікім поспехам. З другога боку пару разоў паказалі, што рэпетыцыі ім неабходныя і, нягледзячы на недахопы гучання, кожны раз заваёўвалі публіку дзякуючы радасці, усмешкам, пазітыўнай энергіі, якая плыве з іхняга дыскапанка і лірычнага тэхна. Лірычнасць, як кажа лідар гурту Норберт Васілюк, гэта вынік прысутнасці ў гучанні скрыпкі і віяланчэлі. Я дадам тут яшчэ і вакальныя гармоніі, бо сам нават без скрыпкі, але з самімі вакаламі песні „Бетону" здаюцца быць настальгічнымі, нават калі гавораць пра багну і цукровую лускаўніцу (бяскрылае насякомае атрада шчацінкахвостак). Сутнасць музыкі заключаецца таксама ў рытме, які мае быць просты і радасны, каб людзям хацелася гуляць. Самае важнае, што ў выпадку „Бетону" за рытмы адказвае камп'ютар.

„Бетон" — гайнаўска-беластоцка-польска-беларускі мікс. Гэта напэўна цікавінка для слухачоў, тым больш цікавая, што ў сеціве паяўляюцца таксама вельмі займальныя кліпы да пасобных песень. Ужо восенню зможам пабачыць відэа на песню „Коля сталяр" у двухмоўным варыянце ды з акцёрамі. Здымкі амаль завершаныя. Нецярпліва чакаем, а калі камусьці не хапае цярплівасці можа ехаць на „Басовішча", ужо на гэтых выхадных.

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 30

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 26:

Як, плод, прыгода, рысунак, Сож, нарада, сын, пакаленне. Проса, крыжык, рыс, чыгун, жона, дар, Ака, даклад.



Беларускія спевы над Ціхім акіянам

Дзіўнымі бываюць шляхі да беларушчыны. Я знаёмы з Вольгай Сухавер ужо пяць год. Нарадзілася яна і вырасла ў Маскве ў сям'і беларускіх выхадцаў са Случчыны. Закончыла прэстыжную Дзяржаўную музычную вучэльню імя Гнесіных (самы вядомы выпускнік гэтай школы — Арам Хачатурыян). Вольга вывучала там народныя спевы і харавое дырыжыраванне. Падчас навучання ўдзельнічала ў экспедыцыях у розныя рэгіёны Расіі, дзе збірала песні ў выкананні мясцовых спявачак. Студыі закончыла з навуковай ступенню магістра музыказнаўства.

З 1992 года Вольга стала пражывае ў Сіэтле на заходнім узбярэжжы ЗША. У 1996 годзе арганізавала расійскі фольк-гурт „Хоровод", які з поспехам выступаў у Сіэтле на пра-



цягу дзесяці год. І вось два гады таму ў Вольгі „заспявалі" беларускія гены. Сёння яна ўжо спявачка беларускага фольк-гурту „Воля", які ўзнік у 2009 г. Лідар гурту — Воля Дземка — некалькі год спявала ў вядомым беларускім гурце „Гуда". У Сіэтле Воля Дземка і Вольга Сухавер разам з Дарынкай Шапавалавай (народжанай у Балгарыі, а ўзгадаванай у Сібіры (!); з беларускім фальклорам пазнаёмілася падчас студыяў у Санкт-Пецярбургскім універсітэце культуры і мастацтваў ды стала спяваць беларускія песні) узялі на сябе місію пазнаёміць ціхаакіянскае ўзбярэжжа Амерыкі з багатымі традыцыямі беларускага фальклору. Рэпертуар гурту складаюць традыцыйныя песні розных рэгіёнаў Беларусі. Спявачкі выступаюць у старажытных строях XIX стагоддзя. Да гурту далучылася яшчэ прафесійная скрыпачка Раіса Асрыянц. У 2010 г. гурт „Воля" выдаў кружэлку „Каралеўна Зямля" з архаічнымі беларускімі спевамі. 28 мая г.г. „Воля" выступіла з новай ужо праграмай на „Northwest Folklife Festival" у Сіэтле.

Ігар ВАШКЕВІЧ

Руіны ўжо разбіраюць

У адным з чэрвеньскіх нумароў „Нівы" пакрытыкаваў я руіны згарэўшай ў 2010 годзе гасцініцы „Сапліцова" ў Белавежы, якія псавалі выгляд мястэчка. І вось, з задавальненнем, інфармую зацікаўленых гэтай справай чытачоў, што 27 чэрвеня г.г. пачалася ліквідацыя згаданых руін. Гасцініца мае быць адбудаваная.

Пётр БАЙКО

Размова з Тамашом Ціханюком, выконваючым абавязкі дырэктара Музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы.

СТАЎКА НА БЕЛАРУСКУЮ КУЛЬТУРУ

— Вы, побач пастаяннай музейнай дзейнасці, ставіце націск на прапагандаванне беларускай культуры на Гайнаўшчыне. Многа Вашых прапаноў накіраваных да маладых людзей або маладыя людзі самі ўключаюцца ў Вашую дзейнасць.

— Калі ў 2004 годзе прыйшоў я на працу ў музей, адразу распачаў супрацоўніцтва з моладдзю з мэтай адраджаць сярод іх беларускую свядомасць. Ударыў я перш за ўсё ў белліцэй. Занёс там многа запрашэнняў на нашыя сустрэчы і заахвочваў ліцэістаў да супрацоўніцтва з намі. Сабралася тады група маладых людзей, якія сталі спатыкацца ў музеі, вучыцца рукадзеллю, займацца іншымі справамі. Група назвала сябе „Этна". Былі ў ёй і палякі, якія зацікавіліся беларушчынай. Калі гэтая моладзь паступіла ў вышэйшыя навучальныя ўстановы, прыязджала ў музей паразмаўляць з намі, бо бачыла важнасць беларускіх спраў. Пасля мы з маладымі людзьмі сталі ладзіць экспедыцыі і збіраць матэрыялы аб мінулым нашых вёсак. Група „Этна" дзейнічала прыблізна ў 2004-2007 гадах. Пры музеі стаў дзейнічаць Фільмавы дыскусійны клуб „Серада", у якім палякі састаўлялі нават большасць актыўных удзельнікаў. Члены клуба глядзелі фільмы, размаўлялі пра іх і нават самі знялі фільм.

— Маладыя людзі, перш за ўсё белліцэісты, арганізавалі пры музеі музычныя калектывы, сталі праяўляць тэатральную актыўнасць.

— Так, пры музеі сталі дзейнічаць маладзёжныя калектывы — эстрадны „На мяжы", трыо „Мальва" з акампаніятарам-акардэаністам і рок-гурт „Верытас". У іх складзе пераважалі вучні і выпускнікі Белліцэя. Анна Шэшка стала весці ў нас кружок іканапісу, а Юліта Такаюк — тэатральную групу „Сявенька", якую пасля ў іншай формуле вёў Ян Карчэўскі. Удзельнікі гэтай групы выступаюць цяпер на нашых мерапрыемствах з сатырычнай праграмай. Дзяўчаты з калектыву „Мальва" сталі пазней весці нашы фэсты. Мы пачалі ў музеі ладзіць рок-канцэрты ў рамках праекта „Музыка без засцярог", на якія прыходзіла многа моладзі. Ян Карчэўскі ў супрацоўніцтве з намі арганізуе ў музеі „Мастацкія сустрэчы школьнікаў", у якіх прымаюць удзел м.інш. вучні, што ходзяць на заняткі беларускай мовы. Апошнім часам рэалізуем праект „Прыгранічны этнічны альянс", у рамках якога адбываліся этнаграфічныя і мастацкія майстар-класы для моладзі. Пасля сталі мы ладзіць журналісцкія майстар-класы пад наглядам Наталлі Герасімюк і з удзелам Зміцера Косціна — журналістаў Радыё „Рацыя". Перадачы юных журналістаў — белліцэістаў, белгімназістаў і вучняў польскага ліцэя — транслявaліся нават па Радыё „Рацыя".

— Таварыства сяброў Гайнаўкі, у якім Вы з'яўляецеся віцэ-старшынёй, у супрацоўніцтве з Беларускім музеем будзе ладзіць 30 ліпеня ў Гайнаўцы, ужо трэці раз, Агульнапольскі фестываль рокавай музыкі „Ракавіска". Ці гурты выступяць там па-беларуску?

— У мінулым годзе беларускія гурты мелі выступіць у конкурснай частцы, але не даехалі, бо былі клопаты з атрыманнем віз. У гэтым годзе запрашаем мы як зорку гурт „Б.Н." з Бярозы. На запасным спіску конкурснай часткі знаходзіцца гайнаўскі гурт „Трус на прывязі", у якім белліцэісты выступаюць таксама са свойскім рэпертуарам.

— У Агульнапольскім фатаграфічным конкурсе „Падляшша ў аб'ектыве", якога сёмы выпуск будзе ладзіць у гэтым годзе музейнае аб'яднанне, таксама прымае ўдзел многа маладых людзей. Ці ўдзельнікі гэтага конкурсу паказваюць прыгожасць нашай прыроды, нашую традыцыю і культуру?

— Удзельнікі конкурсу з Падляшша найчасцей фатаграфуюць прыроду, а тыя з-па-за нашага рэгіёна часта фатаграфуюць нашы абрады, увекавечваюць традыцыі. Фатаграфіі пераможцаў конкурсу цэлы год экспануюцца на выстаўцы. Турысты, якія наведваюць музей, цікавяцца здымкамі, якія паказваюць адметнасці нашага рэгіёна.

— Адным з пераможцаў фотаконкурсу стаў малады гайнаўскі фатограф Тамаш Анікіюк, які стараецца ўвекавечыць Гайнаўку і наваколле на дакументальных фільмах. 19 жніўня плануеце ў гарадскім амфітэатры фільмавае мерапрыемства з паказам фільма Тамаша Анікіюка пра Гайнаўку.

— Мы рашыліся зрабіць сучасную карціну да фільма „Горад на акраіне пушчы" Тамары Саланевіч пра Гайнаўку 1966 года. Сучасную Гайнаўку па слядах Тамары Саланевіч здымае Тамаш Анікіюк. І менавіта гэты і іншыя яго фільмы хочам паказаць на аглядзе ў амфітэатры. Прадбачваем таксама дэманстрацыю некаторых фільмаў Тамары Саланевіч і Пятра Нестаровіча, ураджэнца Орлі. Праграма гэтага мерапрыемства цяпер на дапрацоўцы.

— Зараз праводзіцца рамонт кіназалы. Якія фільмавыя мерапрыемствы плануеце ладзіць у ёй?

— У снежні плануем, так як і ў мінулым годзе, фільмавы марафон з сустрэчамі аўтараў дэманстраваных фільмаў. У бліжэйшым часе прадбачваем арганізаваць некамерцыйнае незалежнае кіно і паказваць дакументальныя фільмы з ухілам на беларускія справы, праваслаўе і Беласточчыну. Хочам таксама дэманстраваць мастацкія фільмы.

— Побач пастаянных музейных экспазіцый ладзіце таксама часовыя выстаўкі мастацтва. 15 ліпеня адкрылася выстаўка сучаснага ткацтва творцаў з Брэста.

— Зараз у нас працуюць выстаўкі графікі Аляксандры Стэльмашонак з Мінска і сучаснага ткацтва групы „Творчасць" з Брэста. У жніўні або верасні адбудзецца адкрыццё выстаўкі мастацкіх работ з ухілам на архітэктуру Гайнаўкі, якія паўстануць у час пленэру, прымеркаванага да 60-годдзя прысваення Гайнаўцы гарадскога права. Частка нашых мерапрыемстваў таксама прымеркаваная да гэтага юбілею.

— Вы арганізавалі ў Янове фэст у рамках праекта „І там жывуць людзі". Дзе будзеце яшчэ ладзіць беларускія фэсты ў гэтым годзе?

— 24 ліпеня плануем фэст у Свінароях, а ў верасні — у Чыжоўскай гміне, праўдападобна ў Кленіках. Пра месца і час правядзення іншых трох фэстаў размаўляем з гміннымі самаўрадамі і чакаем прапаноў ад нашых людзей.

— Якія іншыя беларускія мерапрыемствы плануеце ладзіць у гэтым годзе?

— Прадбачваем арганізаваць у нас два рок-канцэрты ў рамках праекта „Музыка без засцярог", канцэрт у рамках „Бардаўскай восені", „Мастацкія сустрэчы школьнікаў" і, пачынаючы з верасня, будзем ладзіць літаратурныя сустрэчы.

— Аднак асноўная задача Беларускага музея гэта музейная дзейнасць. Што апошнім часам рабілася ў гэтым плане і што прадбачваецца яшчэ рабіць?

— У нас працуюць дзве пастаянныя этнаграфічныя выстаўкі „Дзень за днём" і „Покі хлеб паклалі на стол". Мы ўласнымі сіламі збіралі і збіраем музейныя экспанаты і іх забяспечваем. Цяпер хочам закончыць арганізаванне трэцяй пастаяннай этнаграфічнай выстаўкі, прысвечанай рамёству. Да гэтай пары рыхтавалі мы выстаўку сваімі сіламі і з дапамогай гайнаўскага мастака Віктара Кабаца, але зараз з дапамогай датацыі Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі, якую атрымалі менавіта на гэтую выстаўку, будзем карыстацца парадамі этнографаў з Падляшша.

— У Беларускім музеі мала людзей і сціплыя сродкі на музейную дзейнасць. Ці бачыце магчымасці прыцягнуць большыя сродкі на музейную працу?

— Лягчэй здабыць сродкі на культурную дзейнасць, чым на музейную. Па-за грашыма з Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі ўдалося нам здабыць грошы на музейную работу толькі з Фонду Кроненберга. Цэлы час пішам штораз то новыя праекты ў розныя фонды з надзеяй атрымаць грошы на музейную дзейнасць.

— Доўга Вы не маглі знайсці арандатара вялікага памяшкання, якое раней займаў магазін будматэрыялаў.

— Ёсць суполка зацікаўленая гэтым памяшканнем. Цяпер вядуцца з ёй размовы ў справе арэнды.

— Дзякую за размову і жадаю поспехаў.

Гутарыў Аляксей МАРОЗ

Тэкст і фота
Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Межавы цэнтр Еўропы

(працяг з 29 н-ра)

За Гродзіскам, зараз перад Кярсноўкай, побач дарогі выглядаюць руіны колішняга мураванага збудавання. Маладая жанчына, якая акурат шпацыравала па той дарозе, сказала, што той двор быў гарэў у пачатку 1950-х гадоў, але больш не ўмела мне нічога канкрэтнага сказаць, хаця заявіла мне, што цікавіцца мясцовай гісторыяй. Дадала яна, што мясцовыя людзі вельмі неахвотна гавораць пра той двор. У манаграфіі Сухавольскай гміны аўтарства Яна Гузоўскага так той двор апісаны: „Był to ongiś duży majątek, którego właścicielem na przełomie XIX i XX wieku był Dejsza. Wcześniejsza legenda tego majątku jest nieznana. Po roku 1914 [...] majątek ten przeszedł w posiadanie Niemca o nazwisku Dytt. [...] Niemiec nie dawał robotnikom wyżywienia i kijem popędzał do pracy, a po zachodzie słońca zwalniał, nic nie płacił a jeszcze poszczuł psami. Po drugiej wojnie światowej majątek ten rozparcelowano".

Цэнтр Сухаволі

Крыж каля Кярсноўкі

У пачатку Кярсноўкі, што з боку Гродзіска, запушчаны аднапавярховы будынак грамадскага прызначэння, мабыць колішняя школа. У канцы Кярсноўкі, што з боку Сухаволі, мураваная каплічка і два высокія драўляныя крыжы абапал яе, абгароджаныя абшырным жалезным плотам, аздобленым рэлігійнымі сцяжкамі. Аб гэты плот абаперта і драўляная каплічка-слуп з пустым месцам для святой фігуркі. Перад гэтымі святынямі пажылы мужчына выкошваў пустазелле. Панаракаў ён мне на сваіх вясковых жанчын, якія тыя сцяжкі павывешвалі пад візіт біскупа, а пасля візіту пра тыя сцяжкі і пазабываліся: што гэта за патрыятызм, калі сцяжкі валяюцца па зямлі. Ды засумаваў чалавек, ці хто будзе апекавацца гэтым месцам пазней. Але гэтак дзееца спрадвеку, што старэйшае пакаленне апасаецца бурлівага маладога пакалення, якое пасля таксама пастарэе і заклапоціцца пра будучыню сваёй спадчыны...

Крыж між Кярсноўкай і Астраўком

Драўляныя сасновыя крыжы, як паказвае высечаная на іх дата, былі пастаўлены ў 1924 годзе. Мураваная каплліца, паводле майго размоўцы, была пастаўлена крыху раней, але яшчэ ў міжваенны перыяд. А драўляная каплічка была зроблена яшчэ раней. Была ў ёй фігура святога Войцеха, яшчэ нядаўна, і мабыць звалілася недзе ў траву. Выканаў быў яе чалавек з Акопаў, які таксама выразьбіў гостыю на адным з крыжоў. У даведніку пра крыжы ў Сухавольскай гміне напісана, што мураваная каплічка ў Кярсноўцы была пабудавана ў 1908 годзе.

Крыж насупраць Глыбоччыны

З Кярсноўкі падаюся ў бок Грымячкоў. Вось што пра назву вёскі піша даведнік з 1882 года: „Hrymiaczki, wieś w pow. sokólskim gub. grodzieńskiej o 38 w[iorst] od Sokółki. Wieś ta ma charakterystyczne położenie, jednym końcem dotyka łąk bagnistych a drugim końcem wzgórz, które stanowią jakby ścianę. Od północy bagniste strumyki porosłe dużą olszyną, to wszystko podwaja siłę głosu stwarzając dobrą akustykę w czasie grzmotów i wyładowań atmosferycznych. Stąd nazwa wsi pochodzi od grzmieć. W pobliżu wsi Grymiaczki niegdyś był dwór szlachecki. Bliższych wiadomości o nim brak. A na północ o kilkaset m. od tej wsi na skrzyżowaniu dróg nad strumykiem stała karczma, co było też charakterystyczne dla krajobrazu polskiego". Вось так на скрыжаванне дарог над ручайком вабілі нячыстыя сілы...

З Грымячкоў паходзіў бацька Баляслава Грабінскага: „Бацька мой, Франак, быў уроджаным прыроднікам. Хаця ніколі ён не наведваў школы, але меў асаблівы талент назіральніка й чула ўспрымаў праявы натуры. Ведаў ён, як назваць кожнае зельле, кожную найдрабнейшую кветачку. Знаў ён таксама й птушыны сьвет: ведаў, як бакас, летучы з выраю, бэчаў; дзе было над Баброю гняздо чаплі; як паводзіліся жураўлі на балотах; як улажыць барану на таполі для буславага гнязда, і любіў часта гаварыць пра птушак. Быў ён уражлівай на прыгожасьць натураю. Часта ўспамінаў, якія прыгожыя былі ў Грымячках, дзе ён радзіўся й правёў маладосьць, заходы сонца над белямі паплавамі, залітымі ў вясьняную пару вадою да гарызонту".

Па дарозе з Грымячкоў у Сухаволю процьма крыжоў, мабыць кожны гаспадар так засцерагаў свой участак поля ад сіл нячыстых, што валачыліся тою дарогай. А ў самой Сухаволі, за год маёй там адсутнасці, рашуча памяняўся выгляд цэнтра горада. З'явіўся помнік Ежы Папялушку, з'явіўся пышны фантан, перанесены ў больш цэнтральнае месца рыначнай плошчы валун — знак цэнтра Еўропы. І над усім гэтым арка з жалезных кантовак з такіх жа кантовак крыжам, асвечаным папам Янам Паўлам II. Еўропа тут несумненная. Тут жа яе цэнтр, на мяжы паміж дзвюма яе паловамі, паміж Захадам і Усходам, паміж Еўропай і не-Еўропай...

Крыж у Грымячках

Таццяна ЛУКША, Свіслач

Свіслач

Маленькі гарадок сярод лясоў,
На ўскраі маёй роднай Беларусі
Як моцна я табою ганаруся!
Ты рэчаіснасць, летуценнасць сноў.

Прыгожае імя табе далі
Калісьці людзі, што жылі спрадвеку,
На нашай шматпакутлівай зямлі,
Ды не згубілі гонар чалавека.

Красуйся Свіслач, будзь заўжды такой:
Прыгожай, чыстай, патанай у кветках.
Дзе я не буду, – а заўжды з табой! –
У сэрцы ты маім жывеш навекі.

Тата

У лясным гушчары,
Пад сасной калашматай,
У нябыт адышоў
Ціхім ранкам мой тата

Смерць імгненнай была,
Аб якой ён і марыў.
Ледзь усмешка сышла
З анямелага твару,
Раптам стала старой
Наша родная хата:
Не ідзе за парог
Сустракаць нас, наш тата...

Позна я зразумела
Кошт вялікай утраты,
Колькі слоў не паспела
Йшчэ сказаць табе, тата.

Пэўна іх мне ў жыцці
Будзе вельмі багата...
Ты з нябёс захіні
Ад бяды мяне,тата...

Брату

Ад Радзімы далёка,
– аж за шэсць тысяч вёрст,
Цябе некалі, брат мой, вецер лёсу занёс.
Ты асеў там, прыжыўся, абзавёўся сям'ёй,
Але сэрцам заўжды з Беларуссю сваёй.
Усхвалявана, смакуючы родную мову,
Ты пытаешся ў нас, калі звоніш дадому:
„Ці паспелі трускаўкі, ці адцвіў ужо бэз?, –
А ці ловіцца плотка, ці грыбны зараз лес?"
Ты расказваеш дзецям пра лясы і кар'еры,
Пра цагельны завод, а ім цяжка паверыць
У тваю Беларусь за шырокім прасторам,
Бо вакол толькі стэп, ды высокія горы.
Час бяжыць... ён няўмольны,
– не стала ўжо таты,
Сагравае ж святло вокан роднае хаты,
І якія б жыцця не насталі падзеі,
Яно ў сэрца ліе промні добрай надзеі.

Фонд „Царкоўная Музыка" ў Гайнаўцы

у супрацоўніцтве з: **Белавежскім Нацыянальным Паркам, Белавежскім Цэнтрам Культуры, Аддзелам ПТК у Белавежы**
запрашае на:

IX Белавежскія Мастацкія Інтэграцыі „ПЭРЭТОЧЭ 2011"

Выступаюць калектывы: польскія, беларускія, габрэйскія, цыганскія, татарскія, нямецкія, летувіскія, расейскія, лэмкоўскія...
29 – 30 ліпеня 2011 г.
у 19.00 гадзін

Амфітэатр у Белавежы

Мерапрыемства фінансуецца са сродкаў Міністэрства Унутраных Спраў і Адміністрацыі.

Васіль САКОЎСКІ

Адгалоска да адгалоскі

У 24 нумары „Нівы” ад 12.06.2011 г. паявіўся артыкул Віктара Буры „Гайнаўяне ў Свіслачы і Гродне”. Артыкул напісаны ў стылі „во здравие” прэзідэнту Лукашэнку, яго чыноўнікам і іх палітыцы. Проста яны самі не сумелі б прыгажэй пахваліцца сваімі поспехамі, як зрабіў гэта за іх В. Бура. І менавіта такія артыкульчыкі, ды яшчэ ў замежнай прэсе, ім вельмі патрэбныя цяпер, калі наступае поўны правал іх неразумнай палітыкі. А час не „во здравие”, а „за упокой” пачынаць. „За упокой” беларускай мове, беларускай культуры, беларускай беларускасці. А можа і беларускай незалежнасці.

Вось і не дзіва, што проста пасыпаліся злыя адгалоскі з Беларусі на Бураў артыкул. І, канешне ж, многія беларусы мелі права на тое, каб адчуць сябе пакрыўджанымі і так адрэагаваць на Бураў артыкул.

Зайздросіць беларусам іх, напрыклад, дасканала наладжанага беларускага школьніцтва ці дасканалых парадкаў, справядлівасці і дабрабыту — ад чаго так радуецца Бурава душа — па меншай меры проста несур'ёзна. Быў там адзін выдатны не толькі з назвы, але з літары і духу мінскі беларускі ліцэй пад кіраўніцтвам Уладзіміра Коласа, але ўжо яго няма — выгналі, разагналі, замкнулі. Знайшоў ён прытулак у чужых краінах. Вось якія там адносіны да беларускага школьніцтва, ад чаго смуткуе мая душа і душы многіх беларусаў.

Я прыпамінаю яшчэ з часу маёй працы, як прыязджалі ў нашы школы вучні з беларускіх школ. І як гэтыя дзеці расказвалі, як яны вучацца, хто з іх вывучае англійскую мову, хто нямецкую ці нават кітайскую. Некаторыя з іх някепска гаварылі па-польску. А пра сваю беларускую мову — ні гу-гу. Вельмі крыўдна было глядзець на гэта. Але гэта ж не дзетак віна, толькі адносін беларускіх улад да яе. Прыязджалі таксама дзяржаўныя дэлегацыі, палітыкі, вучоныя, артысты і ахвотна расказвалі пра прыгажосць сваёй краіны, багатую беларускую культуру, магутны беларускі патрыятызм. Але толькі рэдкія адзінкі з іх гаварылі на беларускай мове, якую яшчэ Адам Міцкевіч назваў найбольш славянскай мовай. Значыць, або не ведалі, або саромеліся яе. І канешне ж нагляднa проста таптали сваю багатую культуру і свой патрыятызм і сябе як асобу. І пра гэта трэба абавязкова гаварыць, пісаць, крычаць. Шкада толькі, што так позна дагадаліся, бо ўсе іншыя былыя савецкія рэспублікі ведалі аб гэтым адразу...

Не ўсё мне аднак спадабалася і ў адгалосках. Вось дзве цытаты з адгалоскі Віктара Дзесяціка „Які сняданак — такі і маляванак”: „Прачытаўшы ў „Ніве” № 24 ад 12.06.2011 г. допіс „Гайнаўяне ў Свіслачы і Гродне”, мне стала крыўдна і сорамна за маіх землякоў-беларусаў, якія жывуць за граніцай, на Гайнаўшчыне (...). Вось і атрымліваецца, шаноўныя беларусы з Гайнаўшчыны, што за чарку і шкварку вы не хочаце ўбачыць сапраўднага становішча беларусаў у Беларусі?!”

Прачытаўшы такое, мне таксама стала крыўдна і сорамна за Віктара, але гэтым разам за Дзесяціка. Я ж таксама з Гайнаўшчыны, але не быў тады і ўвогуле не езджу, як і іншыя гайнаўяне, да вас на чарку і шкварку, бо проста не магу глядзець як там распінаюць беларускую мову, беларускую культуру і ўвогуле беларускасць. Ды каб і прыехалі да вас такія, і нават выпілі з вамі традыцыйную чарку і закусілі шкваркай, не будуць яны хваліць таго, чаго ніяк хваліць нельга. Зрэшты, многім нашым хлопцам з такімі поглядамі ўезд у Беларусь забаронены...

Віктар Бура выказаў у гэтым артыкуле толькі свае погляды, а не ўсіх беларускіх жыхароў Гайнаўшчыны. Не пярэчу, ёсць у нас нямала людзей з поглядамі падобнымі як у Буры, але далёка не ўсе. А В. Дзесяцік зваліў нас усіх на адну кучу...

У адгалосцы „Не блытайце” Лявона Карповіча спадабаўся мне даволі арыгінальны падзел беларускага грамадства на... „дзермакратаў” і народ. Першая назва моцна абразлівая, нават вульгарная, а другая — неканкрэтная, расплывчатая. І яшчэ зусім нядаўна беларускія ўлады маглі беспакарана так дзяліць і называць беларускае грамадства, але пасля апошніх падзей, здаецца, ужо не вельмі. Раней спакойны, пакорны, заўсёды прадзяржаўны народ памаленьку перастае быць такім. Пачынае і ён набываць сваю ўласную палітычную арыентацыю, цвёрда кіравацца ёю і адстойваць яе. Так што і беларускім уладам нарэшце пачынае быць менш камфортна як было. І толькі такім спосабам беларускі народ перастане быць толькі пустой назвай, а стане рэальнай палітычнай сілай, а „дзермакраты” — дэмакратамі, з якімі мусяць лічыцца ўлады і прыгажэй называць іх...

Вершы беларускіх паэтаў у Беларусі гэта тое, што па вызначэнні ёсць, але сустрэць іх у тамтэйшых кнігарнях даволі цяжка. З гэтай прычыны асноўнай крыніцай пазнавання сучаснай беларускай паэзіі і знаёмства з новымі асобамі ў ёй становіцца віртуальная прастора. Ну, а каб творцы прывабна прадставіць свой віртуальны твар, ягоны сайт мусіць быць прыцягальным для вока. Адным з прыкладаў такога сайта можна назваць інтэрнэтстаронку паэткі Тацяны Дзям'янавай, дзе выдатна спалучаюцца і цудоўнае афармленне сайта, і цікавы змест вершаў.

Месціцца паэтычная старонка Тацяны Дзям'янавай у інтэрнэце па адрасе **www.lightynna.ru.** На галоўнай старонцы пераважаюць сіне-блакітна-белыя колеры. З правага боку — выява малога хлопца, які спіць на Месяцы. З-за гэтага стварaецца ўражанне, што даны сайт гэта прэзентацыя нейкай кніжкі з казкамі для дзяцей. Насамрэч далёка не ўсе вершы там адпавядаюць дзіцячай тэматыцы.

Тут жа на галоўнай старонцы словы прывітання да наведвальнікаў. Асаблівага расповеду там няма. Адзінае вартае ўвагі паведамленне аб тым, што даны сайт створаны ў межах Нацыянальнага паэтычнага партала, пра які „Ніва” пісала ў № 18 ад 2 мая 2010 года.

Здаецца больш інфармацыі пра паэтку можна было б атрымаць на наступнай старонцы, што носіць назву „Аба мне”, але спадзяванні не спраўджваюцца. На данай старонцы Тацяна Дзям'янава дзякуе тым, хто спрычыніўся да стварэння старонкі, і нічога не паведамляе пра сябе.

Тое, для чаго даны сайт быў створаны — вершы паэткі — мы знойдзем на старонцы „Вершы". Дакладней, там змешчаны вялікі спіс яе твораў. Назва кожнага з іх з'яўляецца гіперспасылкай. Калі клікнуць на яе, то перад вачыма адкрываецца поўны тэкст верша.

Калі знаёмішся з вершамі Дзям'янавай, то заўважаеш жыццёва-побытавы напрамак яе паэтычных зацікаўленняў. Так, верш „Здыму кватэру за інтым” выкрывае адносіны да сексу як да сродка аплаты за жыллё. На такую ж „камерцыйную” тэму і верш „Купляйце мінскае паветра”, дзе распавядаецца аб продажы паветра ў прыгожай упакоўцы.

У той жа час Тацяне Дзям'янавай не чужыя і глабальна-філасофскія тэмы. Напрыклад, верш „Зямля ўжо ледзь трывае нас” выдатна тлумачыць, што не гаспадары мы на гэтай планеце, а толькі госці. „...Хоць чалавек на словах — цар,/ Але на справе — шчэ нябога —/ Нядбайны гарагаспадар,/ Калі судзіць аб гэтым строга.// Бо ўсё забруджване вакол,/ Прыроду цнотную знішчае,/ Бузіць, сваволіць, бы асёл, —/ Нібыта розуму не мае//...Шукае Бога ў абразах,/ А Духу Боскага не бачыць./ Сапраўдны скарб знішчае ў прах/ А з-за фальшывай горка плача.// Свае адстойвае правы,/ А быць адказным не гатовы./ Не хоча браць да галавы/ Старых прароцтваў мудрых словы:// „Нібы вада, пральецца кроў,/ Душа зняволіцца за целам.../ У свеце знішчыцца любоў.../ А сэрца... стане скамянелым...”// Ды толькі Творцу бачна ўсё —/ Ён сее буру хмарай грознай:/ „Нашто дарыў я ім жыццё?/ Ці не забраць, пакуль не позна?”.

Адной з асаблівасцей сайта паэткі з'яўляюцца рэйтынгі, якімі вымяраецца папулярнасць у наведвальнікаў яе вершаў і іх катэгорый. Згодна гэтых рэйтынгаў найбольш цікавымі застаюцца вершы Тацяны Дзям'янавай аб каханні.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Скарбы Беларусі

Стадыён „Дынама”

Шаноўнага чытача магчыма здзівіць, што ў пералік выдатных аб'ектаў беларускай гісторыі, нацыянальных каштоўнасцей я залічаю зараз мінскі стадыён „Дынама”. Асабліва вытанчанымі архітэктурнымі формамі сталічны „калізей” не вылучаецца і наўрад ці можа моцна ўразіць пры наведванні. Прыкладам, дэкаратыўная скульптура „Бег” — класічная праява мастацтва эпохі сацрэалізму. І разам з тым, хоць бы колькасцю людзей, якія наведалі за апошнія паўстагоддзя гэтую арэну, аб'ект увойдзе ў лік найбольш папулярных у нашай краіне месцаў.

Першасны стадыён „Дынама” быў збудаваны ў страшныя сталінскія часы: адчынены ў 1934 г., рэканструяваны ў 1939 г. Як вядома, пасля другой сусветнай вайны Мінск амаль увесь ляжаў у руінах, не ацалела і спартовае збудаванне. Новы стадыён быў пабудаваны ў 1947-1954 гг. (асноўныя архітэктары Мікалай Колі і Міхаіл Парусінкаў). Чарговую сур'ёзную рэканструкцыю арэна перажыла, калі яе рыхтавалі да алімпійскага футбольнага турніру 1980 г. Асноўныя гульні праходзілі ў Маскве, але частка пяцікальцовага „пірага” перапала і некаторым саюзным рэспублікам. Так эстонскі Талін атрымаў права на рэгату, а ўкраінскі Кіеў і беларускі Мінск — на папярэднюю стадыю футбольнага спаборніцтва. Такім чынам „Дынама” прымаў алімпійскія зборныя Алжыра, Сірыі, Іспаніі, Югаславіі, Фінляндыі, Коста-Рыкі, Ірака.

У 1982 г. першае і адзінае золата футбольнага першынства краіны савецкаў мінская каманда кавала цягам сезона на розных палях, вырашальныя пераможныя бітвы адбыліся на маскоўскай сінтэтыцы (здаецца, з часоў Альгерда беларусы не мелі ў Маскве такога трыумфу!), але бальшыня ачкоў была набрана якраз на „Дынама”, дзе кшталтаваўся беларускі патрыятызм і гонар. А 14 верасня 1983 г. мне, тады яшчэ школьніку з вёскі, давялося стаць сведкам еўракубкавага дэбюту нашага флагмана. Відовішча было незабыўнае — больш пяцідзесяці тысяч гледачоў у адзіным парыве віталі першы гол і першую вікторыю любімай каманды. Гол са штрафнога Юрыя Курненіна (светлай памяці!) дагэтуль стаіць у вачах.

У 1985 г. Мінск зноў атрымаў права на групавы турнір — на гэты раз стадыён прымаў юніёрскі чэмпіянат свету. Адзіны свой „увал” (хто не ведае — гэта выхадны дзень падчас службы ў войску) з вучэбнай часткі сувязі за паўгода муштры аўтар гэтых радкоў патраціў менавіта на наведванне гульні першынства. Потым была процьма іншых матчаў, сярод якіх пад канец існавання СССР памятны фарс мінскага „Дынама” з душанбінскім „Памірам”. Гэта быў канец савецкага футбола ва ўсіх сэнсах. Сімвалам перамен у канцы васьмідзесятых стаў канцэрт на „Дынама” рок-гурту „ДДТ”, на які мы ездзілі ўжо студэнцкай кампаніяй. Да слова, лідар „ДДТ” Юрый Шаўчук і зараз актыўна выступае за дэмакратычныя перамены як у Расіі, так і ў Беларусі.

Суверэнны час прынёс заўзятарам новыя жарсці. Найбольш памятная (і пераможная!) гульня зборнай краіны — 7 чэрвеня 1995 г. з Нідэрландамі. Ужо прайшоў ганебны рэферэндум па змене нацыянальнай сімволікі, але людзі прыйшлі на матч менавіта з бел-чырвона-белымі сцягамі. Іх налічвалася некалькі соцень і магу сцвярджаць, што аніводны мітынг апазіцыі ў найноўшай гісторыі, не збіраў столькі нашых штандараў. Пазней сцягі сталі забіраць „праваахоўнікі”, на гульні ўжо не пускалі нават у кашульках адпаведных колераў і многія кінулі хадзіць і прыязджаць на міжнародныя матчы. Мы не перасталі любіць футбол, мы проста чакаем, калі сталічны стадыён „Дынама” зноў стане нашым.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Тэкст і фота Віктара БУРЫ

Бабулін пірог са шпітальнай кухні

Шпіталь у Гайнаўцы вядомы далёка па-за межамі Падляшша. Яго многа разоў паказвалі ў якасці ўзорнага ў агульнапольскім і замежным тэлебачанні. У ім працуе высокакваліфікаваны персанал, які карыстаецца сучасным медыцынскім абсталяваннем для ратавання жыцця. Пра пацыентаў, апрача лекараў і медсясцёр, паспяхова дбае персанал бальнічнай кухні. Харчаванне для хворых вельмі старанна і смачна рыхтуюць вопытныя кухаркі. Сярод прысмакаў, якія хваляць не толькі пацыенты, увагу прыцягвае бабулін пірог.

Дрожджавы пірог шпітальная кухня рыхтуе таксама на продаж. Пякуць яго з пшанічнай мукі тыпу 500 з дадаткам натуральных прадуктаў (дрожджы, малако, яйкі, цукар, соль), без штучных пякарскіх парашкоў, якія папраўляюць смак і выгляд вырабу.

Злева: Марыя Пашчук і Галена Каліноўская

Бабулін пірог можна захоўваць цэлы тыдзень і за гэты час не траціць ён ні смакавых якасцей, ні выгляду, а пры нарэзцы не крышыцца. Можна яго спажываць як з салодкімі, так і з салёнымі дадаткамі (у ім малая колькасць цукру). Бабулін пірог могуць есці таксама асобы, якія пакутуюць ад хвароб стрававальнага тракту.

Непаўторны смак бабулінага пірага вядомы не толькі ў Гайнаўцы, ці ў Падляшскім ваяводстве. Пірог трапляе ў Англію, Бельгію, Украіну і Беларусь. Не забываюць аб ім і пацыенты, якія вяртаюцца дамоў пасля выздараўлення. Прычынай папулярнасці пірага з'яўляецца тое, што старэйшым напамінае ён смак дзяцінства, адтуль і яго назва. Смакуе ён таксама дзецям і моладзі.

На рынку прадаецца шмат хлебабулачных вырабаў, але гайнаўскаму бабулінаму пірагу няма роўных. Гэта вялікая заслуга кухарак гайнаўскага шпіталя і іх шэф-кухара Марыі Стэльмах.

АДЫШЛА БЛ. П. ТАМАРА БЕЛАКАЗОВІЧ

Фота з архіва аўтара

Памінкі пасля смерці бл. п. праф. Васіля Белаказовіча 1 III 2010 г. У цэнтры яго жонка Тамара Белаказовіч.

15 мая г.г. адышла ад нас бл. п. цётка Тамара Белаказовіч — жонка сусветнай славы славіста-гісторыка літаратуры, бл. п. праф. Васіля Белаказовіча (1932-2010). Народжаная ў 1930 г., была родам з Залешан. Банда „Бурага" спаліла іх дом, страляла па ёй, яе сястры, браце і маці, калі ўцякалі яны праз акно. Пасля вайны і гэтага здарэння, яе бацькі пасяліліся ў Бельску. Вывучала яна рускую філалогію, пазнаёмілася з будучым прафесарам і пасялілася ў Варшаве. Была вернай Музай бл. п. Прафесара. Вучоны прысвяціў Ёй усю сваю кніжку пра праф. Міколу Янчука родам з Паўдзённага Падляшша — *Mikołaj Janczuk (1859-1921). Podlaskie skrzyżowania tradycji słowiańskich* (WSP, Olsztyn 1996) з прысвячэннем: „Mojej żonie Tamarze, niestrudzonej i wiernej Podlasiance, poświęcam". Яе бацька, Якаў Базылюк, быў вядомым беларускім нацыянальным дзеячам. За сваю дзейнасць сядзеў у даваеннай польскай турме. Пісала пра яго заходнебеларуская прэса. 15 мая дапоўнілася жыццёвая, нацыянальная і творчая легенда гэтай славутай сям'і. Ціха і спакойна цётка Тамара адышла ад нас назаўсёды! Ва ўспамінах засталіся незабыўныя мае з Ёю размовы амаль да апошніх хвілін Яе жыцця! Гэта дзякуючы Ёй я адкрыў, што з'яўляемся мы сваякамі. Мая бабуля, бл. п. Сафія Хвашчэўская, і яе бл. п. маці, Яўгенія Базылюк, народжаная Краўчук, былі двайнымі сёстрамі. Мая бабуля плакала, калі гарэлі Залешаны, у тым ліку і іх дом, спадзяваючыся найгоршага! Пахараны бл. п. цёткі Тамары адбыліся 20 мая на варшаўскіх праваслаўных могілках. Хай будзе Ёй пухам сталічная зямля!

Юрка ТРАЧУК

Войт Нарваўскай гміны і дырэктар Нарваўскага асяродка культуры сардэчна запрашаюць 23 ліпеня (субота) а 17.00 гадз. у Нарву на святкаванні

XII ДЗЁН НАРВЫ

Гадз. 17.00 — Адкрыццё XII Дзён Нарвы
Прэзентацыя мастацкіх дасягненняў НАК: — Хары з Ласінкі (Гармонь, Зараначка, Рамонка), АРТ-ПРОНАР, СЕЛЕКТЫЎ, СЕРВІС, СКАНЕР, НАРВА, ПАДЛЯШАНКІ, Зорка вечара — НОРБІ
Танцавальны вечар з гуртамі Нарва і Селектыў

ЗАПРАШАЕМ

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі рэбусу, складуць рашэнне — сенегальскую пагаворку.

1. старажытнагрэчаскі бог падземнага свету = 15 _ 21 _ 13 _;
2. рака ў цэнтры Аўстраліі (*Bulloo*) = 3 _ 25 _ 5 _ 23 _;
3. белая ў Камянцы = 11 _ 17 _ 1 _ 2 _;
4. збудаванне для абагравання хаты = 22 _ 19 _ 24 _;
5. гарадскі пасёлак у Бешанковіцкім раёне пры ўпадзенні аднайменнай ракі ў Дзвіну = 14 _ 16 _ 12 _;
6. мяккая трубачка для зубной пасты = 9 _ 26 _ 7 _ 8 _ 20 _;
7. кітайская грашовая адзінка = 6 _ 4 _ 18 _ 10 _.

(ш)



Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 25 нумара

Кручок, сцяг, вера, жывапіс, Рым, Іпуць, дзеяч, чапля, ахапак, Асвея, ліпа, айчым, каваль.

Рашэнне: **Чужыя грахі перад вачыма, а свае за плячыма.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.

Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк, Янка Целушэцкі.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty.
Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju.
Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734
Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2011 roku — 52.
Przesyłka zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.
Przesyłka priorytetowa: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 7,20 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 000 egz.

24.07 — 30.07

(22.03. — 20.04.) Твая імпульсіўнасць, гарачка ў справах і паспешлівыя высновы і за гэтым паспешлівыя дзеянні могуць разваліць сямейную ідылію. Няўменне і нежаданне разумець людзей могуць табе пашкодзіць і ў іншых адносінах. У рэзультаце пад канец тыдня ўсе могуць цябе знялюбіць!

(21.04. — 21.05.) Быкі захочуць змяніць свой цывільны стан! Венера ў знаку Льва пабудзіць у табе жарснасць; можаш закахацца або перажыць раман. Дарэчы, твае рашэнні ў гэты тыдзень не будуць вельмі прадуманымі. Хоць іншыя будуць думаць, што ведаеш у чым справа і нават будуць раіцца ў цябе!

(22.05. — 22.06.) Цяжкасці з рашэннямі; можаш паверыць у штось, што зусім не няправільнае. Магчымая юрыдычная валакіта, работа з дакументамі, пошукі асобы, якая расставіць усё на свае месцы. Можаш зняць з сябе груз адказнасці і праблем, ды будзеш і так не вельмі рады ад рэзультату. Дарэчы, цешся і тым малым, што маеш і здабываеш.

(23.06. — 23.07.) Ты перапоўнены ідэямі і адчаем, каб іх рэалізаваць. Можаш пачаць змены ў жыцці ў інтэлектуальнай сферы (асвоіць новыя галіны дзейнасці, пачаць вывучаць мову). Будзеш задаволены. У час маладзіка Месяца ў знаку Льва (30.07.) атрымаеш цікавую прапанову працы; варта яе абмеркаваць.

(24.07. — 23.08.) Можаш спахапіцца на смелыя эксперыменты, усё пойдзе па-твойму. Каля 28.07. адчуеш сябе богам сексу, такім будуць цябе і бачыць! 27-31.07. будзеш прымушаны адмовіцца ад чагосьці, на чым табе залежыць; не ўпірайся на сваім. Будзеш мець магчымасць няблага падзарабіць. Важным будзе выбар паміж загадам і просьбай.

(24.08. — 23.09.) Выйдзеш з хаты і будзеш актыўным (з 28.07.). Атрымаеш вялікі прыліў энергіі, задзівіш усіх кемлівасцю, задумамі і трапнымі заўвагамі. Варта падумаць і пра адпачынак. Толькі пільнуйся абманшчыкаў і круцялёў, не дайся ўкрунуць сябе ў канфлікт, у падарожжы пільнуй багаж. Выберы адну мэту і да яе імкніся.

(24.09. — 23.10.) Адкрыюцца новыя перспектывы, асабліва ў прафесійным плане і ў пытаннях супрацоўніцтва. Удалыя кантакты — працоўныя і асабістыя. Добры час на саюзы і здзелкі, вырашанне сямейных спраў.

(24.10. — 22.11.) Ты вельмі пагружаны ў матэрыяльныя справы, будуеш планы на будучыню, ды ніяк не можаш вырашыць, які выбраць шлях. Добры час для любых пачаткаў, ды патрабуе трапнага рашэння. Перамажы ўнутраныя сумненні (яны цябе скоўваюць больш чым іншыя перашкоды), выберы дарогу і дзейнічай — будзе поспех. Не рвіся ва ўсе бакі!

(23.11. — 22.12.) У гэты момант найлепшы спосаб дзеяння — нічаганерабленне! Не натужвайся. Ні логіка, ні жарсны парыў ды ўгаворы ў гэты момант не давядуць да пастаўленай мэты. Гэта час, калі сітуацыя ідзе па-свойму, не так як хацелася б. Пачакай лепшага моманту. І не выдавай грошай, бо накупіш барахла. Адпачывай!

(23.12. — 20.01.) Паляпшэнне здароўя і формы. Ды супакойся і расслабся, не мусіш нічога даказваць і вырашаць аб важным. Цешся і адпачывай. Хатняя ўтульнасць і эмацыянальная стабільнасць. Малады Казярог можа наладзіць знаёмства, якое будзе мець перспектыву. Даверся лёсу і яму не супрацоўляйся, усё пойдзе як найлепш.

(21.01. — 19.02.) Будзеш дзейнічаць на ўсю катушку, паявяцца шчаслівыя нагоды і спрыяльныя людзі. Самотны Вадалей хай будзе кантактны і эмацыянальны — восьвось доўгачаканая любоў! Трымайся светлага боку сваіх пачуццяў! Калі выбярэш адпачынак — не фарсіруйся. 25-29.07. твае рашэнні будуць трапныя і ўсё ўдасца.

(20.02. — 21.03.) Не кідай сваім знаёмым крыўдных заўваг, могуць моцна абразіцца. На шчасце чакае цябе многа мілых знаёмстваў. 27-31.07. — нялёгка ў важных размовах (могуць цябе зразумець наадварот). Не лаві лёсу за хвост, пачакай, каб адвярнуўся да цябе тварам! Ён вядзе цябе па шляху, ідзі за ім без аглядкі. Не супрацоўляйся здарэнням.

Агата АРЛЯНСКАЯ

Сяргей ЧЫГРЫН

Валілы, Аргенціна, Узбекістан

„Ён беларус сярод узбекаў...”

Гэты здымак, які сёння публікуецца, я з Віталем Лубам летась адшукаў у фотаархіве „Нівы”. Хутчэй за ўсё яго ў 1970-х гадах прыслаў у тыднёвік з Ташкента беларус Іосіф Грыцук, які быў родам з вёскі Валілы.

Здымак зроблены быў у Ташкенце (Узбекістан) у 1970-х гадах. На ім сфатаграфаваны два беларусы з нялёгкім лёсам — вышэйназваны Іосіф Грыцук з Беласточчыны і паэт, доктар філалагічных навук, прафесар са Случчыны Сцяпан Ліхадзіеўскі.

У сакавіку 1970 года „Ніва” надрукавала ліст з Ташкента. Аўтарам гэта ліста быў Іосіф Грыцук. У ім наш зямляк расказаў пра свой жыццёвы лёс і пра тое, як ён трапіў у сталіцу Узбекістана. Аказалася, што ў пошуках свабоды і хлеба наш суайчыннік спачатку ў 1929 годзе выехаў у Аргенціну. Там пражыў да 1955 года. У тым годзе пачалася рээміграцыя і беларусы пачалі масава вяртацца на Радзіму. Праз тры гады вярнуўся дамоў і валілаўскі юнак. Але яму дазволілі прыехаць не на Беларусь, а ў Ташкент. Там ажаніўся і па спецыяльнасці працаваў на мэблевай фабрыцы.

Сцяпан Ліхадзіеўскі і Іосіф Грыцук

Аргенцінскае пасведчанне Іосіфа Грыцука прыналежнасці да беларускай арганізацыі

Упершыню Іосіф Грыцук з жонкай наведаў свае Валілы і Беласточчыну ў 1968 годзе. Трыццаць гадоў не быў на Бацькаўшчыне. „Калі мне ўдалося за 30 гадоў разлукі з радзімай пабываць у роднай вёсцы, то я лёг на зямлю і цалаваў, як родную маці. Кожнае дрэва ў вёсцы, што запамятаў у маленстве, было мне мілае сэрцу. Усюды хацелася пабываць, усё паглядзець. Пайшоў да рэчкі. Супрасль акультурылі. Стала ручайком, няма рыбы ні ракаў, бо дзе ж ім жыць? І дзецям няма дзе плаваць. Шкада, перастараліся меліяратары. Пачуўся скрып у паветры. Я ўзняў вочы ў неба: сумна скрыпелі жураўлі — ляцелі ў цёплы край. Пакідалі свой кут на паўгода і то сумавалі. Можа таму, што не ведалі, ці вернуцца. Мне жураўлі нагадвалі срып колаў воза майго дзядзькі з Падзалук, які вёз нашу сям'ю ў 1929 годзе на беластоцкі вакзал. Мы тады не ведалі, што нас чакае ў Аргенціне: уцякалі, як жураўлі, у цёплы край. Праводзіў я вачыма жураўлёў і думаў: я шчаслівы, бо вярнуўся на сваю радзіму, хоць на кароткі час...” — прыгадваў Іосіф Грыцук (Георгій Валкавыцкі, *Віры*, Беласток 1991, с. 125).

Завітаў наш зямляк у рэдакцыю беларускага тыднёвіка „Ніва” ў Беластоку. Тадышні рэдактар тыднёвіка Георгій Валкавыцкі спытаў у яго: „Чаму пасля Аргенціны не прыехалі на Беласточчыну?” Іосіф Грыцук уздыхнуў: „Даражэнькі, з гэтай марай я і баразніў акіян, але ж завезлі ў Ташкент. А калі я пачаў прасіцца на „родину”, адказалі: „здесь тоже родина”, жыві, маўляў, і не рыпайся. І жыў...”.

Пасля 30-гадовай ростані Іосіф Грыцук сустрэў у родных Валілах свайго школьнага сябра Юльяна Дзярманскага. На Бацькаўшчыне выпісаў два экземпляры беларускай „Нівы” — адзін сабе ў Ташкент, другі — сваякам у Нясвіж. А калі вярнуўся ва Узбекістан, дасылаў невялікія допісы ў „Ніву”, распавядаў на чужбіне ўсім пра сваю Радзіму.

У Ташкенце Іосіф Грыцук пазнаёміўся з многімі землякамі, якія там жылі. Асабліва шчыра беларус з Беласточчыны сябраваў са Сцяпанам Ліхадзіеўскім — беларускім пісьменнікам, лёс якога таксама быў няпростым.

Сцяпан Ліхадзіеўскі нарадзіўся на Случчыне ў беднай сялянскай сям'і. Са школы дасылаў невялікія допісы ў часопіс „Малады араты”. У 1926 годзе паступіў у Белпедтэхнікум. Пасля тэхнікума вучыўся ў Белдзяржуніверсітэце і ў Мінскім вышэйшым педагагічным інстытуце. Як малады літаратар, нават атрымліваў персанальную стыпендыю ад Наркамасветы.

У 1928 годзе Сцяпан Ліхадзіеўскі ўступіў у літаратурнае аб'яднанне „Маладняк”, быў сябрам Беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў. Выдаў зборнікі вершаў „Рокаты дальняй прыстані” (1931), „Чырванеюць вішні” (1931), „Крывавыя знічкі на снезе” (1932), „Мы — маладая гвардыя” (1932).

Першае спачуванне малады літаратар заслужыў за тое, што па даручэнню калгасцэнтра ў самым пачатку 1930-х гадоў праводзіў калектывізацыю ў беларускіх вёсках, у тым ліку і ў роднай вёсцы Баслаўцы на Случчыне. Другое спачуванне ён заслужыў за тое, што ў 1933 годзе беспадстаўна быў асуджаны на тры гады высылкі ў Казахстан. І трэцяе спачуванне ён заслужыў, што на Беларусь ужо ніколі не вярнуўся. Але Сцяпан Ліхадзіеўскі ці не адзіны з выпускнікоў Белпедтэхнікума, хто з „ворагаў народа” стаў прафесарам і доктарам навук.

Пасля адбыцця трохгадовага тэрміну Сцяпан Ліхадзіеўскі дамоў вяртацца пабаяўся, а прыехаў у Ташкент і быў залічаны на трэці курс мясцовага педінстытута. Адначасова ў 1937-1939 гадах працаваў выкладчыкам рускай мовы і літаратуры ў школах Ташкента і Томска. Скончыў Томскі педінстытут і аспірантуру Ташкенцкага інстытута. З цягам часу беларус абараніў кандыдацкую, а потым доктарскую дысертацыі па творасці Анатоля Франса, стаў прафесарам Ташкенцкага ўніверсітэта, загадваў кафедрай замежнай літаратуры. Ён паспяхова спалучаў педагагічную дзейнасць з літаратурнай. Падрыхтаваў да выдання і выпусціў у свет у Мінску зборнікі вершаў і перакладаў „Берасцянка жывых трывог” (1962) і „Вянкі камунарам” (1974). Актыўна перакладаў на беларускую мову вершы ўзбекскіх паэтаў, творы французскіх і нямецкіх пісьменнікаў. Апублікаваў шэраг прац пра спадчыну Анатоля Франса, матэрыялы па ўзбекскай літаратуры, яе сувязі з беларускай літаратурай. Пісьменнік заўсёды сумаваў па Беларусі. А аднойчы, па незразумелай прычыне ад другой асобы, ён напісаў такія радкі:

Жыве ў Ташкенце чвэртку веку,
Не знае, дзе закончыць век.
Ён беларус сярод узбекаў,
Між беларусаў ён узбек.

Беларусы сярод узбекаў так і засталіся на далёкай зямлі Сярэдняй Азіі. А гэты фотаздымак сёння проста нагадвае пра іх. Тым больш, што летась беларусу з Беласточчыны Іосіфу Грыцуку споўнілася б 100 гадоў з дня нараджэння, а беларусу са Случчыны Сцяпану Ліхадзіеўскаму 100 гадоў было б сёлета ў красавіку.

ISSN 0546-1960